Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
9 ЖНІЎНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 152 (30032)



БУДЫНАК ПРАДЗЕНЫ... ШТО ДАЛЕЙ?

КАБ НЕ АДАРВАЎСЯ ТРОМБ...



6

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

- Рухавікі ММЗ устаноўлены на рачныя судны і паспяхова праходзяць выпрабаванні на адкрытай вадзе.
- **«Белавія» аб'явіла скідкі на некаторыя напрамкі.**
- Амаль 40 экіпажаў камбайнераў у Гомельскай вобласці пераадолела тысячную мяжу па намалоце збожжа.
- **У Беларусі ў студатрадах працаўладкавана ўжо больш як 30 тысяч маладых людзей.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр МАСЯЙКОЎ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў, алімпійскі чэмпіён:**

*«Нашы апаненты спрабуюць стварыць нам праблемы. Але тут адбываецца адваротны працэс: мы ўдасканальваемся, ствараем свае спаборніцтвы. Гульні краін СНД — першы крок, другі крок — Гульні БРІКС, наступныя спаборніцтвы, якія плануюцца ў Расійскай Федэрацыі, — Гульні дружбы. Мы суверэнныя дзяржавы, якія маюць свае магчымасці, патэнцыял, спартыўныя арэны, высокі ўзровень і трэнераў, і спартсменаў. Гэта значыць, калі вы не хочаце нас там бачыць, мы будзем праводзіць свае спаборніцтвы і не чакаць ад кагосьці нейкіх падачак. А яны, калі не могуць перамагчы нас на спартыўных арэнах, тады ўключаюць адміністрацыйны рэсурс. А мы, вядома, яму супрацьдзейнічаем. Бо ўсё, што нас не забівае, робіць нас мацнейшымі».*

ISSN 1990 — 763X

З першых вуснаў

# «МЫ БУДЗЕМ ЗАБЯСПЕЧАНЫ ЎСІМ НЕАБХОДНЫМ»

### Якія задачы паставіў Прэзідэнт перад новым міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання, у цэлым перад галіной

**Пасля прызначэння Ігара Брыло памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Віцебскай вобласці пасада міністра сельскай гаспадаркі і харчавання вакантнай заставалася нядоўга. З 8 жніўня гэты адказны кірунак жыццядзейнасці краіны ўзначальвае Сяргей Барташ, які дагэтуль з'яўляўся памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Гомельскай вобласці. Прызначэнне новага кіраўніка ведамства адбылося ў фармаце міні-нарады з пастаноўкай усіх прадметных задач па аграпрамысловым комплексе.**



Фота БелТА.

## Ад агранома да міністра

У пачатку размовы Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што перш за ўсё яго выбар абумоўлены ўзростам і вопытам новага кіраўніка Мінсельгасхарча. «З некалькіх кандыдатур, якія мне былі прапанаваны тыдзень таму, я выбіраю вас, бо ў вас прыстойны жыццёвы шлях, — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да новага міністра сельскай гаспадаркі і харчавання. — Вельмі важна, каб міністр абавязкова папрацаваў кіраўніком у сельскагаспадарчым прадпрыемстве».

Гэта, па словах Прэзідэнта, важна і ў прамысловасці: каб міністр або віцэ-прэм'ер прайшоў шлях кіраўніка той ці іншай прамысловай арганізацыі. «У вас гэты вопыт ёсць, — заўважыў, звяртаючыся да Сяргея Барташа, кіраўнік дзяржавы. — Вы працавалі ў раённым звяне. Гэта азначае, што на ўзроўні гаспадаркі, сельскагаспадарчага прадпрыемства (і аграномам вы былі, і гэтак далей) і на ўзроўні раённага звяна вы добра ведаеце ўсе працэсы. Больш за тое, вы папрацавалі і на абласным узроўні, займаючыся пытаннямі сельскай гаспадаркі. Затым — ужо на самым высокім узроўні: памочнікам Прэзідэнта, што дало вам магчымасць зверху паглядзець на тыя праблемы, якія сёння вырашаюцца на сяле, якія вы добра ведаеце, працуючы на зямлі». Беларускі лідар упэўнены, што як чалавек патрыятычны Сяргей Барташ успрымае рашэнне Прэзідэнта правільна.

## «Самае галоўнае — сяўба азімых»

Кіраўнік дзяржавы абмеркаваў з новым міністрам сітуацыю ў сельскай гаспадарцы, у прыватнасці ход уборачнай кампаніі. «Як у народзе кажуць, мы ўбіліся ў сярэдзіну ўборкі, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Гэта добра. Вы, напэўна, памятаеце са свайго вопыту: калі палову збіраем ураджаю пасеянага, ужо неяк лягчэй становіцца. Бо ўбіраеш самыя праблемныя звычайна ўчасткі. Для цяперашніх умоў надвор'я гэта вельмі важна».

СТАР. 2

Гісторыя газеты — гісторыя краіны

# Як «Звязда» адраджала Палессе

### Сёння, у 106-ы дзень нараджэння газеты, згадваем адзін з самых цікавых перыядаў у яе біяграфіі

**«Звязда» на меліярацыі Палесся» (орган ЦК КПБ, Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў Беларускай ССР) убачыла свет 1 красавіка 1972 года. Выданне хоць і з'яўлялася спецыяльным выпускам да рэспубліканскай «Звязды», але ўяўляла з сябе паўнавартасную самастойную газету.**

СТАР. 12–13



ЗВЯЗДА
НА МЕЛІЯРАЦЫІ ПАЛЕССЯ
ВАЖНЕЙШАЯ ЧАСТКА САЦЫЯЛЬНАЙ ПРАГРАМЫ
НАШ СУСЕД—ШВЕЦЫЯ

Жніво-2023

# СТРАВЫ НЕ ГОРШЫЯ, ЧЫМ У ГОРДАНА РАМЗІ

### Карэспандэнт «Звязды» высвятляла, ці смачна кормяць хлебаробаў

**У сталовай аграгаспадаркі «Зара» Магілёўскага раёна з раніцы не менш горача, чым на перадавой уборачнай. Каб камбайнеры і кіроўцы паказалі добрыя вынікі, яны павінны быць як мінімум накормленыя. І кухары не шкадуюць ні прадуктаў, ні фантазіі, каб стравы атрымаліся смачнейшыя. У 11 гадзін раніцы ўсё павінна быць нагатавана і падрыхтавана для дастаўкі на палеткі. Хлебаробы ў полі з самай раніцы. Трэба, каб да гадзіны дня яны паабедалі і вярнуліся да працы. Тут, як той казаў, кожная хвіліна дарагая.**



СТАР. 3

# «МЫ БУДЗЕМ ЗАБЯСПЕЧАНЫ ЎСІМ НЕАБХОДНЫМ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На думку кіраўніка дзяржавы, тыя, хто ўжо ўбраў праблемныя ўчасткі, асабліва на захадзе (тое, што там было шмат палеглых хлябоў, Прэзідэнт бачыў асабіста падчас паездак у рэгіёны), сёння калі не будуць спаць, то больш-менш заспакояцца. «Калі празвалі дзесьці — пасля такіх лівеняў уборка ўскладняецца, — канстатаваў беларускі лідар. — Я папярэджваў усіх — вы, напэўна, сочыце і згодны са мной, — што цяпер будуць спрасаваныя ўсе работы. Трэба ўбіраць усё. І тут нас лета падвяло. 45 дзён без дажджоў (асабліва ў цэнтры і на ўсходзе) — травы падгарэлі. А цяпер яны бурна пайшлі ў рост».

Супала ўсё: уборка збожжавых і зернебабовых, нарыхтоўка травяністых кармоў, саломы... Але самае галоўнае, на думку Прэзідэнта, — сяўба азімых. Рапс пачалі сеяць паўсюдна, на чарзе — азімы ячмень. У сувязі з гэтым пастаўлена задача як мага хутчэй вызваліць палі пад сяўбу азімых культур. Аб тым, што многімі сельскагаспадарчымі работамі прыйдзецца займацца адначасова, Аляксандр Лукашэнка папярэджваў падчас рабочых паездак у рэгіёны.

## «Усё нармальна складваецца»

Кіраўнік дзяржавы ахарактарызаваў тое, у якіх умовах даводзіцца забяспечваць харчовую бяспеку. «У нас, у Беларусі, як заўсёды: то засушыць, то залье, — дадаў Прэзідэнт. — Таму трэба было рыхтавацца, што Гасподзь нам вылье ўсё тое, што 45 дзён не выдаваў у выглядзе дажджу. Вось яно і адбылося. Вы гэта бачыце, ведаеце гэтыя праблемы».

Аднак, нягледзячы на няўстойлівае надвор'е, Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што мы будзем забяспечаныя ўсім неабходным. «Мы нарыхтуем крыху менш чым мільён тон для дзяржпатрэб збожжавых каласавых, патрэбную колькасць рапсу, — удакладніў ён. — Усё тут нармальна складваецца. Калі арганізуемся як належыць, мы не будзем мець і праблем, звязаных са збожжам для жывёл. Але цяпер патрэбна мабілізавацца».

Прэзідэнт разумее, што найбліжэйшыя два-тры дні жніво будзе ісці не такімі тэмпамі, як хацелася б. «Два дні дакладна ў поле не ўлезеш, на трэці дзень толькі, — заўважыў ён. — Можа, дзесьці лягчэй, як у вас, у Гомельскай вобласці. Напэўна, усё-ткі не такія лівені ў вас былі. Гэта і добра. Для Гомельшчыны ніколі не бывае лішніх дажджоў. Сёлета Гасподзь вас быццам бы не пакрыўдзіў».

Кажучы аб усходнім рэгіёне Беларусі, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу: для яго вельмі важна, што новы міністр сельскай гаспадаркі і харчавання добра ведае Гомельскую вобласць. «Нам Гомельскую вобласць трэба імем рэвалюцыі выцягваць з таго балота, у якім яна апынулася, — падкрэсліў ён. — Вы гэта бачыце, бачыце лепш за мяне. Там Іван Іванавіч Крупко (старшыня Гомельскага аблвыканкама. — **удакл. «Зв».**), чалавек, які хоча працаваць, можа, разумее ў сельскай гаспадарцы. Трэба будзе дапамагаць, вядома».

Нямала праблем, па словах Прэзідэнта, і ў Магілёўскай, Віцебскай і Мінскай абласцях. «Сёння галоўную ўвагу трэба ўдзяліць сяўбе азімых, — паўтарыў ён. — Я ўжо казаў: па Віцебскай вобласці, Магілёўскай вобласці, ды па ўсіх абласцях, асабліва на паўночнай частцы Беларусі, вельмі важна своечасова пасеяць. Вельмі важна! І пасеяць раннія культуры — рапс азімы, ячмень, каб раней пачаць убіраць у будучым годзе. Чаму? Бо калі заканчваецца ўборка ў Брэсцкай вобласці, на поўдні Беларусі, мы толькі ўцягваемся ва ўборку ў Віцебскай вобласці з прычыны ўмоў надвор'я. Таму выхад адзін — сеяць культуры, якія раней трэба ўбіраць. Дзесьці хоць бы з сярэдзіны ліпеня. І такіх культур у Віцебскай вобласці дакладна павінна быць не менш за палову. Як бы цяжка ні было, нам гэта трэба рабіць».

**Вераніка КАНЮТА.**

### У тэму



У размове з журналістамі новы **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сяргей БАРТАШ** прызнаўся, што задаволены магчымасцю працягнуць работу ў галіне, якой прысвяціў усю сваю працоўную дзейнасць і якую вельмі любіць. Па яго словах, уступаць у гэтую пасаду адказна ў любы час. «Сёння ўборка збожжавых у актыўнай фазе, заўтра пачнецца сяўба азімых культур, азімых рапсу і ячменю, далей — масавая ўборка, нарыхтоўка кармоў, кукурузы — гэты працэс не спыняецца, ідзе круглы год», — адзначыў ён.

Па словах Сяргея Барташа, айчынны аграпрамысловы комплекс мае значны патэнцыял для нарошчвання аб'ёмаў вытворчасці і павышэння яе якасці. «Гэта не той узровень вытворчасці, які павінен быць», — удакладніў ён і падкрэсліў, што мы маем значна вышэйшы патэнцыял.

Як перакананы міністр сельскай гаспадаркі і харчавання, першачарговую ўвагу трэба ўдзяліць сферы жывёлагадоўлі і ў найбліжэйшую пяцігодку выканаць задачу па завяршэнні будаўніцтва малочнатаварных комплексаў, пераводзе жывёлы на ўтрыманне менавіта ў такіх умовах. «На асаблівым кантролі будзе павышэнне якасці малака і зніжэнне затрат, — заўважыў ён. — Таксама трэба актыўна развіваць раслінаводства, якое дасць магчымасць забяспечыць жывёлу дастатковай кармавой базай».

Сяргей Барташ падкрэсліў, што сёння сельская гаспадарка дае магчымасць працаваць усім галінам. Ён удакладніў, што перапрацоўчыя прадпрыемствы працуюць на сыравіне, якую вырабляе сельская гаспадарка. Сельская гаспадарка, у сваю чаргу, не можа абысціся без тэхнікі, якую стварае прамысловы сектар эканомікі. «Усё завязана на сельскай гаспадарцы, — падкрэсліў міністр. — Ад поспеху работы сельскай гаспадаркі залежыць поспех усяго ў цэлым у краіне».

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### 23 краіны заявілі аб жаданні ўступіць у БРІКС




Лідары 23 дзяржаў афіцыйна выказалі жаданне далучыцца да БРІКС, аб гэтым на прэс-брыфінгу заявіла кіраўнік МЗС ПАР Наледзі Пандор. Такая цікавасць пацвярджае важнасць арганізацыі як абароны інтарэсаў «глабальнага Поўдня». Пра гэта паведаміла РІА «Навіны». Паводле інфармацыі, якую агучыла кіраўнік МЗС ПАР, былі атрыманы не толькі афіцыйныя заяўкі ад лідараў 23 краін аб далучэнні, а таксама шмат неафіцыйных запытаў. Сярод краін, якія выказалі гатоўнасць далучыцца да БРІКС, пералічаныя Алжыр, Інданезія, Беларусь, В'етнам, Марока, Аргенціна, Тайланд, Бангладэш, Палестына, Куба, Сенегал, Эфіопія, Гандурас, Іран, Кувейт, Венесуэла, Саудаўская Аравія, Казахстан, Бахрэйн, ААЭ, Балівія, Егіпет і Нігерыя.

### У Нігеры прызначылі новага прэм'ер-міністра




У Нігеры мяцежнікі прызначылі новага прэм'ер-міністра краіны. Гэтую пасаду заняў эканаміст Алі Махаман Ламін Зэйн. Заява аб прызначэнні новага прэм'ера прагучала ў эфіры дзяржаўнага тэлебачання Нігера RTN. Раней Алі Махаман Ламін Зэйн быў міністрам фінансаў, цяпер з'яўляецца прадстаўніком Афрыканскага банка развіцця ў Чадзе, паведаміла выданне ActuNiger. Як вядома, вайскоўцы Нігера ў канцы ліпеня аб'явілі аб адхіленні ад улады прэзідэнта Махамеда Базума. Камандуючы прэзідэнцкай гвардыяй генерал Абдурахман Чыані з'явіўся ў эфіры дзяржаўнага тэлебачання як кіраўнік сфарміраванага ўдзельнікамі перавароту Нацыянальнага савета па абароне айчыны.

### Больш за мільён жыхароў Усходняга ўзбярэжжа ЗША засталося без электрычнасці з-за буры



Экстрэмальнае надвор'е закранула некалькі штатаў — ад Місісіпі да Нью-Ёрка, паведаміла ТАСС. Лініі электраперадачы абрываліся пад націскам моцнага ветру, ён зрываў дахі дамоў, у некаторых штатах адзначаныя падтапліванні. Больш за ўсё перабояў у электразабеспячэнні зарэгістравана ў Паўночнай Караліне, Пенсільваніі, Мэрылендзе і Джорджыі. Паводле даных тэлеканала CNN, ёсць ахвяры. У Джорджыі загінуў прынамсі адзін чалавек. З-за буры прыпынілі работу аэрапорты ў штатах Нью-Ёрк, Нью-Джэрсі, Пенсільванія, а таксама ў сталічнай акрузе Калумбія.

Кантэкст

# «МАРАФОН» — І НІЯКАГА МАХЛЯРСТВА?

## Або Чычыкаў бы пазайздросціў

**Пра тое, што рознага кшталту зборы данатаў, якія ладзяць «лідары» збеглых, прычым робяць гэта і ў Вільнюсе, і ў Варшаве, то па чарзе, то адначасова, ідуць на ўтрыманне гэтых самых лідараў, зразумелі ўжо, напэўна, нават самі змагары. Адзін Стрыжак са сваім «Байсолам» чаго варты. Дурняў, гатовых ахвяраваць грошы невядома на што, становіцца ўсё менш. А «лідарам» хочацца есці, прычым пажадана ў добрых рэстаранах, таму ў ход ідзе не толькі выманьванне «ахвяраванняў» у тых, хто ім яшчэ верыць, але і раскручванне схем па канвертацыі шэрых грошай. Пад выглядам «збору ахвяраванняў».**

Гэтым разам «штаб» у Вільнюсе аб'явіў цэлы «марафон» па зборы сродкаў «у фонд палітвязняў». Разгарнулі цэлую піяр-кампанію ў сацыяльных сетках. Пасты былі ў тым ліку па-англійску — заходняя публіка больш успрымальная да слова «палітвязні». На гэта і разлічвалі, як і на тое, што чулівыя еўрапейцы або амерыканцы ва ўсё іншае і ўнікаць не будуць. Бо данацыі прапаноўвалі і на памілаванага Пратасевіча, і на мастака, які памёр, і на грамадзянку Швейцарыі, якая даўно ўжо ў Швейцарыю вярнулася...

Але і гэта, мяркуючы па ўсім, мала дапамагло. Еўрапейцам самім хочацца есці, а прадукты там нятанныя. Ужо той факт, што калі падчас «марафону» ў анлайн-эфіры выступала самая галоўная «лідарка», глядзелі яе выступленне 230 карыстальнікаў, яскравае таму сведчанне. Тым не менш пасля заканчэння імпрэзы было бадзёра абвешчана аб сабраных больш чым 500 тысяч еўра, якія ахвяравалі нібыта 10 тысяч чалавек. Адкуль такая нестыкоўка? Усё вельмі проста, і нават не трэба быць вялікім аналітыкам, каб здагадацца. «Штаб» элементарна пераВёў свае ж грошы з рахунку, скажам так, не вельмі легальнага, на рахунак, з якога іх можна спакойна здымаць і траціць. На ўласныя патрэбы, прыкрыўшыся ўжо згаданымі «мёртвымі душамі» «палітвязняў». Чычыкаў бы пазайздросціў.

Тут яшчэ адна прычына гэтага фокуса вымалёўваецца. На Захадзе ўсё менш і менш цікавасці да збеглых «лідараў», у тым ліку і ў тых, хто дае ім грошы. Не апраўдалі, так бы мовіць, чаканняў. Байка пра сабраныя за некалькі дзён пяцьсот тысяч ад дзесяці тысяч прыхільнікаў — даволі нязграбная спроба паказаць спонсарам, што «кабінет» яшчэ мае нейкія шанцы ажыццявіць задуманае, падняць людзей, якіх «о-го-го колькі». Праўда, на каго тая байка разлічана, невядома. Бо тыя, хто плануе і аплачвае каляровыя рэвалюцыі, далёка не дурні і падобную прымітыўную схему вылічаць на раз-два.

Ды што тут казаць, калі нават самі змагары ўсумніліся ў выніках «марафону». Асабліва дапытлівыя палічылі, што нават калі гэткая сума і сапраўды была, дык хваліцца асабліва няма чым. Калі падзяліць яе на агучаную колькасць «палітвязняў», атрымаецца каля 380 еўра на брата. А яшчэ аднялі ўсялякія бюракратычныя траты — накшталт банкаўскіх камісій і аперацыйных расходаў — тады і ўвогуле атрымалася ледзь не напалову менш. З-за чаго тады ўвесь шум? — пытаюць скептыкі, якіх у змагарскіх шэрагах становіцца ўсё больш. А некаторыя нават пачалі лічыць, колькі ж з тых беларусаў, што знаходзяцца за мяжой, нададаціла ў фонд. Аказалася (і гэта калі верыць «штабу» пра дзесяць тысяч) — усяго адзін працэнт. Такая вось «масавая падтрымка беларускага пратэсту».

«Варшаўскі офіс» таксама не застаўся ў баку — аферу ж правярнулі без іх. Цяпер на інтэрнэт-пляцоўках і ў анлайн-эфірах ідзе высвятленне адносін. Зрэшты, тут нічога новага. Барацьба за грошы ад гаспадароў — сапраўдны праклён «беларускага пратэсту». І ўжо не ў першым пакаленні...

Вось толькі «палітвязням» — тым, што паверылі «лідарам» і выйшлі перакрываць дарогі і кідаць камяні ў міліцыю, а цяпер адбываюць заслужанае пакаранне, ні на каліва ад гэтага не лягчэй. Іх выкарысталі тры гады назад, выкарыстоўваюць і цяпер. Зрэшты, і тут нічога новага няма...

**Аляксей КЛІМАЎ.**

# СТРАВЫ НЕ ГОРШЫЯ, ЧЫМ У ГОРДАНА РАМЗІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На будучы ўраджай сёння працуе шмат людзей самых розных прафесій. Вось і мы са старшынёй прафсаюза работнікаў АПК Магілёўскага раёна Валянцінам Салаўём едзем на палі ўзнімаць настрой. Валянцін Адамавіч — каб адзначыць перадавікоў, я — каб даведацца, ці не пакрыўджаныя яны харчаваннем.

Загадчыца сталовай аграгаспадаркі Аліна Рослава дэманструе меню. Чытаю: «Салата «Марское дно», боршч халодны, ножкі фаршыраваныя, каша грэцкая, сок апельсінавы, пернікі, хлеб, вада» — досыць сытны набор. Не менш апетытная і вячэра. Салата з гародніны з каўбасой, катлета «Папараць-кветка», каша рысавая, сок таматны, хлеб і зноў вада пітная. У аўторак спякота крыху спала, а дагэтуль хлебаробы шчыравалі плюс 35 і болей.

— З наступленнем уборачнай кампаніі сталовая працуе ва ўзмоцненым рэжыме, — удакладняе загадчыца. — Работнікі атрымліваюць абед і вячэру, прычым бясплатна. На абед заўсёды халодная закуска, гарачыя стравы, гарнір, абавязкова піццё, сок і дэсерт — можа быць фрукт, пернік або выпечка ўласнай вытворчасці. Напрыклад, смажанка або бяляш. А палове першай машына дастаўляе абеды на поле. Там камбайнераў і кіроўцаў абслугоўвае наш работнік, які таксама выязджае ў рэйс. Усё падаецца ў аднаразовым посудзе.



Падарункі ад прафсаюза і гаспадаркі.

У машыне, акрамя абедаў, едуць стол, крэслы, парасон — умовы для камфортнага прыняцця ежы на свежым паветры. Нават лыжкі і відэльцы металічныя, бо былі заўвагі, што пластмасавыя хутка псуюцца.

У сталовай пакуль ні душы, хоць падчас абеду таксама людна. Тут гатуюць ежу на сто чалавек. Амаль палова харчуецца дыстанцыйна. Гаспадарка мае палеткі як у Магілёўскім, так і ў Чавускім раёне. А адлегласць — не адзін дзясятак кіламетраў. Калі трэба паспяшацца і ўсюды паспець, едзе яшчэ адна машына.

— Вячэру вязём у чатыры-пяць гадзін, — удакладняе Аліна Рослава. — У меню салат, другое плюс гарнір, пітная вада, сок або чай. Стараемся зрабіць комплекс як мага больш разнастайным. Адзін раз на тыдзень абавязкова прысутнічае рыба, гатуем таксама прысмакі з курацiны і свініны. Два разы на тыдзень робім адбіўныя, запечаныя з сырам або грыбамі.

Кухар Марыя Сарокіна — малады спецыяліст з вопытам. Яна скончыла тэхналагічны каледж і Беларускі ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій. У сваёй рабоце арыентуецца на Гордана Рамзі — брытанскага шэф-кухара, рэстаратара, вядучага тэлешоу «Пякельная кухня».

— Гэта адзін з сусветных прафесіяналаў, — удакладняе Марыя. — У яго заўсёды ўсё самае лепшае. Ён выкарыстоўвае ўсе існуючыя ў свеце кірункі ў прыгатаванні страў.

Марыя, мне здаецца, магла б з лёгкасцю апярэдзіць гэтага Рамзі. Бачыў бы ён тыя 40-50-літровыя каструлі, з якімі мая суразмоўніца спраўляецца. І сакрэты гатавання надзейна трымае пры сабе.

— Мы не выдаём сакрэты, — усміхаецца дзяўчына. — Скажу толькі, што гатуем па-дамашняму, каб было смачна і мужчыны былі задаволеныя. Працую я ўжо амаль дзесяць гадоў, апошнія пяць у гэтай арганізацыі.

**Намеснік генеральнага дырэктара ЗАТ «Агракамбінат «Зара» Ларыса КАВАЛЬЧУК** падкрэслівае важнасць місіі.

— Вы мужа дома не накарміце, паглядзіце, які з яго будзе работнік, — кажа яна. — А тут мужчыны цяжка фізічна працуюць, часам па 12 гадзін. Паспрабуйце не пакарміць — якая атрымаецца работа? У нас усе добра працуюць.

Пакуль размаўлялі і фатаграфаваліся, машына з абедамі паехала на палі. Таму прыйшлося прыбавіць газу, каб паспець пацікавіцца, ці спадабалася ежа камбайнерам. А яшчэ паспець паціснуць рукі ўсім тым, хто сёння пераадолеў тысячны, двухтысячны і набліжаецца да трохтысячнага рубяжоў.

— Сярод нашых лідараў — камбайнеры ЗАТ «Сервалюкс Агра» Сяргей Май і Рыгор Бокач, якіх узнагароджвалі ў пятніцу і суботу, — удакладняе Валянцін Салавей. — Таксама адзначаем кіроўцаў. Камбайнеру і яго памочніку па сто рублёў уручаем, а таксама майку, кепку і падзячнае пісьмо. Плюс налепка на шкло камбайна або машыны. Акрамя таго, падарункі дае гаспадарка.

Кіроўцу МАЗа Юрыя Манкевіча ад аграгаспадаркі «Зара» віншуем проста на ўзбочыне дарогі Магілёў — Віцебск каля павароту на санаторый «Сосны». У працаўніка кожная хвілінка на ўліку. Стэлефанаваліся, каб можна было перасячыся дзесьці па дарозе. Ён якраз вёз збожжа на зерняток гаспадаркі. Не маглі не пацікавіцца, ці спадабалася ежа.

— Смачна ўсё — і суп, і салаты, і катлеты, — усміхаецца ён. — З дому нічога не бяру. Наогул там амаль не бываю. У сям'і двое дзяцей, але калі пасяўная ці ўборачная, рэдка бачымся. Іду на работу, яны яшчэ спяць, вяртаюся, яны ўжо спяць.

Юрый Манкевіч працуе ў гаспадарцы 11 гадоў і практычна заўсёды атрымлівае ўзнагароды за высокія паказчыкі. У тым ліку і непасрэдна падчас святкавання галоўнага фэсту працаўнікоў вёскі «Дажынкі».

На ўборачнай у ЗАТ «Агракамбінат «Зара» штодзённа задзейнічаныя восем камбайнаў, столькі ж МАЗаў. Працоўны дзень пачынаецца рана і цягнецца да позняга вечара. Прагнозы на ўраджай добрыя, нягледзячы на ўсе капрызы надвор'я.

Адно з аддаленых палёў «Зары» — у Чавускім раёне, да якога больш чым 50 кіламетраў. Там працуе некалькі лідараў жніва, якіх таксама трэба павіншаваць. У тым ліку і перадавік з ліку маладых.

Паспяваем на месца якраз пад канец абеду.

— Прэтэнзій да ежы няма, усё вельмі смачна, — прызнаецца механізатар Віталій Буры. — Ежа сытная, нават дабаўкі не трэба прасіць. Калі пераесці, у камбайне дрэнна сядзець.

Добрая ежа наогул палова справы, разважае суразмоўнік. На рабоце з самай раніцы, у абед ужо хочацца чымсьці падсілкавацца. Віталю на дзень хапае калгаснай ежы. Дома толькі на чай застаюцца сілы.

Аляксандр Верхатураў абедае, не адыходзячы ад камбайна.

— Гарачае смачнае, мне першае заўсёды падабаецца, — каментуе ён.

Падмацаваўшыся, ён атрымлівае з рук старшыні прафсаюза работнікаў АПК Магілёўскага раёна падарункі за поспехі ва ўборцы і зорку на камбайн з паметкай «1000».

Пад'язджае яшчэ адзін перадавік — Раман Сарокін. Ён кіроўца МАЗа, перавёз дзве тысячы тон збожжа. Спрытны, таму што малады, смяецца ён.

Хлопцу ўручаюць грошы і падзяку, цісну́ць руку і натхняюць на чарговыя рэкорды.

— У гаспадарцы працую пяты сезон, — расказвае маладзён. — Нядаўна ажаніўся. Мая Вольга тут жа працуе. Абяцаюць даць жыллё. Падымаюся вельмі рана і адразу ж бягу на работу. Я цяпер чалавек сямейны, трэба забяспечваць сям'ю.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**
*Магілёўскі і Чавускі раёны.*

**У тэму**

Паводле інфармацыі прафсаюза работнікаў АПК Магілёўскага раёна, на 8 жніўня ў раёне было з ліку двухтысячнікаў два камбайнеры і два кіроўцы, а таксама з ліку тысячнікаў шэсць кіроўцаў і пяць камбайнераў.

Стыхія

# Неба як прарвала

## Наступствы непагадзі ў панядзелак

**З прычыны багатага выпадзення ападкаў і праходжання навальнічнага фронту з парывамі ветру да 20 м/с у панядзелак стыхія нарабіла шмат бед у многіх рэгіёнах краіны. Падавалася, што ў небе ўтварылася дзірка: настолькі шчыльнай сцяной і амаль без перапынку ў многіх месцах ішоў лівень. Карціну дапаўнялі парывы ветру, грукат грому і амаль што цемра за акном. Нябесная канцылярыя ў гэты дзень разышлася не на жарт...**

### Лясным гектарам — суцэльныя высечкі

У Глыбоцкім раёне дрэва ўпала на жылы дом. Пашкоджаны адзін будынак. Пацярпелых не было.

Але далей — болей... У Мінскай вобласці ад стыхіі ў выніку пацярпела больш за 40 гектараў лесу. Паводле папярэдніх звестак, найбольшыя страты непагадзь нанесла Бараўлянскаму спецлясгасу Мінскага раёна. Там трэба будзе правесці 25 гектараў суцэльных высечак. Сярод найбольш пацярпелых — Бараўляны, Астрашыцкі Гарадок і Калодзішчы. Ёсць таксама пашкоджанні ў Смалявіцкім, Лагойскім, Вілейскім лясгасах — у кожным прыкладна па пяць гектараў. Акрамя таго, шмат паваленых адзінкавых дрэў.

Да канца лесфонд яшчэ не абследавалі, такая работа будзе праводзіцца паралельна. На Міншчыне разлічваюць завяршыць суцэльныя санітарныя высечкі на працягу месяца. Адначасова ў планавым парадку будуць прыбіраць пашкоджаныя адзінкавыя дрэвы.

### Згарэў хлеў, пашкоджаны аўтамабілі

У Магілёўскай вобласці з-за непагадзі без электрычнасці былі 177 населеных пунктаў. Падчас непагадзі вецер узмацніўся, што стала прычынай пашкоджання даху на 27 аб'ектах, у тым ліку 17 малочнатаварных фермах і шасці грамадскіх будынках.

Былі адключаны 449 трансфарматарных падстанцый (17 малочнатаварных фермаў, адна кацельня). На 6.00 8 жніўня адключанымі заставаліся 126 населеных пунктаў і 268 трансфарматарных падстанцый (сем малочнатаварных фермаў). Супрацоўнікі МНС выязджалі на прыборку дрэў, якія ўпалі, 71 раз, усяго прыбрана 105 дрэў. Імі пашкоджаны дзесяць легкавых аўтамабіляў у Бабруйску, Магілёве і Шклове. Пацярпелых не было.

У аграгарадку Боханы Хоцімскага раёна каля 17.00 маланка трапіла ў хлеў, які загарэўся. Агонь поўнасцю знішчыў будынак.

### Загінуў чалавек, у іншых былі траўмы

На жаль, непагадзь прынесла і трагічны выпадак. Паблізу вёскі Сосенка Вілейскага раёна дрэва ўпала на мужчыну, які ад атрыманых траўмаў памёр. Калі пачаўся ўраган, жонка са старэйшым дзіцем схавалася ў машыне, а ён з 11-гадовым сынам вырашыў перачакаць непагадзь у палатцы.

Закрыты пералом, рэзаную рану галёнкі і ўдары цела атрымалі трое пацярпелых ва Ушацкім і Лёзненскім раёнах. Так, ва Ушацкім раёне траўмы атрымала дзяўчынка 9 гадоў, яе аператыўна даставілі ў мясцовую бальніцу, там аказалі дапамогу. Яе стан медыкі ацэньваюць як здавальняючы. Таксама ва Ушацкім раёне ў выніку падзення дрэва пацярпела жанчына. Трэці выпадак зафіксаваны ў Лёзне, дзе мужчына атрымаў множныя ўдары цела шыферам, сарваным моцным ветрам.

### Цягнікі рухаліся з адхіленнем ад графіку

Праходжанне навальнічнага фронту з парывамі ветру і моцнымі лівінямі прывяло да шматлікіх падзенняў дрэў на чыгуначныя пуці і лініі электразабеспячэння на ўсіх аддзяленнях Беларускай чыгункі.

Паводле інфармацыі прэс-цэнтра магістралі, агульная працягласць участкаў, на якіх былі адзначаны збоі ў электразабеспячэнні і рабоце сродкаў сігналізацыі і сувязі, склала 335 кіламетраў, 225 бытавых спажыўцоў было адключана ад электразабеспячэння.

З-за непагадзі 51 пасажырскі цягнік (з улікам тых, якія паступалі са спазненнем з тэрыторыі Расійскай Федэрацыі) рухаўся з адхіленнем ад устаноўленага графіка руху. Затрымка склала ад шасці хвілін да 1 гадзіны 46 хвілін.



Фота прэс-службы «Мінскэнерга».

На ліквідацыі пашкоджанняў інфраструктуры было задзейнічана больш за 500 работнікаў і 75 адзінак тэхнікі БЧ. Для электразабеспячэння 41 чыгуначнай станцыі прымяняліся дызель-генератарныя агрэгаты. У мэтах забеспячэння бяспекі на чыгуначных пераездах, якія засталіся без электразабеспячэння, была выстаўлена ахова.

Пацярпелых і пашкоджанняў рухомага саставу не зафіксавана.

Цяпер на ўчастках Магілёў — Крычаў, Віцебск — Езярышча, Орша — Віцебск і Полацк — Круляўшчызна працягваюцца работы па аднаўленні электразабеспячэння, у сувязі з чым на гэтых участках магчымыя нязначныя адхіленні асобных цягнікоў ад графіка руху. Прымаліся аператыўныя меры па аднаўленні электразабеспячэння бытавых спажыўцоў.

### Ліквідацыя вялася кругласутачна

У Беларусі за мінулыя суткі пасля непагадзі электразабеспячэнне было адноўлена ў 1829 населеных пунктах. Наступствы стыхіі ліквідавала каля 1,2 тысячы чалавек, было задзейнічана 365 адзінак тэхнікі. Паводле даных на раніцу 8 жніўня, аднаўленчыя работы працягваліся ў 655 населеных пунктах. Аварыйныя брыгады задзейнічаныя кругласутачна для ліквідацыі наступстваў непагадзі.

Няпростыя суткі выдаліся для мінскіх энергетыкаў. Па стане на 9.00 8 жніўня заставаліся адключанымі дзве высакавольтныя лініі электраперадачы 35кВ і 24 лініі 10кВ, выяўлены пашкоджанні 52 апор. Найбольш пацярпелымі раёнамі з прычыны непагадзі з'яўляюцца Мядзельскі, Мінскі, Бярэзінскі і Вілейскі.

Найбольш напружаная сітуацыя склалася ў Віцебскай вобласці, дзе навальнічны фронт стаў прычынай масавага падзення дрэў на лініі электраперадачы, іх абрыву. Работы па аднаўленні электразабеспячэння ў рэгіёне наступным пасля непагадзі днём працягвалі больш як у 400 населеных пунктах. На дапамогу віцебскім энергетыкам былі накіраваны брыгады з Гродзенскай і Магілёўскай абласцей.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

II ИГРЫ СТРАН СНГ БЕЛАРУСЬ 2023

Павел СТАРАСВЕЦКІ:

# «У Гомельскай вобласці будзе больш алімпійскіх медалёў, дзякуючы ў тым ліку і II Гульням краін СНД»

**Неаднаразова падкрэслівалася, што ідэя праводзіць спаборніцтвы II Гульняў краін СНД абсалютна новая для Беларусі. А нешта новае заўжды крыху палохае і здзіўляе. Але ў той жа час рэалізацыя новых ідэй — гэта выхад з зоны камфорту, унікальны досвед, які дазваляе зрабіць крок наперад. Да старту II Гульняў краін СНД у многіх не аднойчы паўставала пытанні: «а як гэта будзе», «ці справяцца рэгіёны?», «ці будуць на трыбуных гледачы?» і мноства іншых, выкліканых не сумненнямі ў здольнасцях рэгіёнаў, а апасеннямі перад рэалізацыяй новых ідэй. Праз чатыры дні Гульняў можна сказаць, што апасенні былі марныя. Рэгіёны са сваёй задачай справіліся. Гомель, дзе ўжо прайшлі спаборніцтвы па дзюдо, — дакладна. Тое ўбачылі і спартсмены, якія засталіся ў захапленні ад сучаснай арэны, і публіка, якая нават у рабочыя дні знайшла магчымасць прыйсці на спаборніцтвы. Цяпер экзамен трымае Жлобін, ён прымае спаборніцтвы па самба. Як Гомельская вобласць рыхтавалася да II Гульняў краін СНД і як гэты форум паўплывае на яе далейшае спартыўнае жыццё, паразважалі з начальнікам упраўлення спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама Паўлам СТАРАСВЕЦКІМ.**



***— Павел Анатолевіч, вы як кіраўнік спартыўнай галіны ў рэгіёне задаволеныя тым, як праходзяць II Гульні краін СНД? Усе задуманае атрымалася рэалізаваць?***

— Так. І асабліва задаволены ўсімі службамі. Спартыўнае мерапрыемства сабрала людзей з самых розных сфер дзейнасці. Я задаволены транспартнымі, камунальнымі службамі, медыцынай, прэсай, службай бяспекі, людзьмі, якія адказваюць за размяшчэнне і харчаванне, культурнымі дзеячамі. І я вельмі ўдзячны ім. Мы працуем адной згуртаванай камандай, і ў нас пакуль усё атрымліваецца. Ацэнку мы будзем даваць пазней. А пакуль усё добра. Гомель ужо правёў спаборніцтвы, мы атрымалі станоўчыя водгукі і пачулі шмат цёплых слоў. Прыйшла чарга Жлобіна. Палац гульнявых відаў спорту для правядзення турніру па самба поўнасцю гатовы. Аб'екты размяшчэння гатовыя. Беларуская нацыянальная зборная каманда па самба ўжо знаходзіцца там на вучэбна-трэніровачным зборы. І гэта своеасаблівы плюс для нашай зборнай, бо яны будуць выступаць на знаёмай пляцоўцы.

***— Што было самым складаным у падрыхтоўцы да правядзення Гульняў?***

— Мабыць, скаардынаваць работу ўсіх службаў. Мы працавалі пад чуйным кіраўніцтвам Міністэрства спорту і турызму. Былі створаны сістэмы кіравання рэспубліканскага, рэгіянальнага і аб'ектавага ўзроўню. Калі толькі прыступілі да работы, было крыху незразумела. Але калі кожны пачаў выконваць свае задачы, справа пайшла. Важна, каб кожны разумеў, хто за што адказвае, і тады любое мерапрыемства атрымаецца на ўсе «сто». Лагістыка — таксама вельмі складаны ўчастак работы. Гледачы бачаць, што спартсмен выйшаў на татамі і выступае. А арганізатары думаюць аб тым, што ён павінен прыехаць у залу своечасова, выступіць, своечасова паехаць на абед, прайсці допінгавы кантроль і ўсё гэта павінна быць дакладна выверана па часе.

***— Якую ацэнку далі госці спаборніцтваў па дзюдо?***

— Вядома, нам было цікава атрымаць зваротную сувязь ад нашых гасцей. Кожны ўдзельнік спаборніцтваў прайшоў нямала стартаў рознага ўзроўню. Шмат хто казаў, што спаборніцтвы арганізаваныя на ўзроўні чэмпіянату Еўропы. Я не буду казаць, што вышэй, бо ёсць свае нюансы. Я сам як былы спартсмен магу сказаць, што такі сардэчны прыём умеюць аказваць, мусіць, толькі ў нашай краіне. Мы павінны зрабіць усё, каб тыя, хто змагаецца на татамі, прыехалі да нас зноў. Мы прапрацавалі арганізацыю не толькі спаборніцкай, але і культурнай, турыстычнай праграм. Спачатку госці скептычна паставіліся да такіх прапаноў, маўляў, мы ж прыехалі бароцца. Але ў выніку ўсе каманды скарысталіся магчымасцю не толькі выступіць на спаборніцтвах, але і паглядзець славутасці нашага краю.

***— Вядома, што гарады прымаюць тыя віды спорту, якія ў іх добра развітыя. Гомельшчына вядомая як радзіма адзінага ў нашай краіне алімпійскага чэмпіёна па дзюдо Ігара Макарава. А як сёння ў рэгіёне развіваюцца дзюдо і самба?***

— Калі казаць пра спартсменаў такой узроставай катэгорыі, як удзельнікі Гульняў краін СНД, то спартсмены Гомельскай вобласці на рэспубліканскіх спаборніцтвах ніжэй тройкі прызёраў не апускаюцца. Дзюдо ў вобласці цяпер на пад'ёме. Спрыяе гэтаму і асоба Ігара Макарава, які жыве і працуе ў Гомелі. Ён выкладае ў нашым дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны, перадае свой вопыт будучым трэнерам па дзюдо, якія, спадзяюся, застануцца працаваць у Гомельскай вобласці і будуць развіваць гэты найцікавейшы від спорту. Работы ім хопіць, дзюдо сёння развіваецца ў 13 раёнах вобласці.

Нашым самбістам ёсць чым ганарыцца, гомельскія спартсмены нязменна займаюць прызавыя месцы на рэспубліканскіх і міжнародных стартах. Нягледзячы на тое, што гэта не алімпійскі від спорту, ён вельмі відовішчны і захапляльны. Паколькі самба сканцэнтраванае пераважна ў краінах постсавецкай прасторы, думаю, на турніры ў Жлобіне будзе вельмі цікава. А ўлічваючы што выступаюць дарослыя спартсмены (а гэта заўжды цікавей), там будзе фурор. Я думаю, пасля Гульняў краін СНД у Жлобіне мясцовыя ўлады прымуць рашэнне адкрыць аддзяленне па самба. У цэлым, калі хоць бы дзесяць чалавек з дзвюх тысяч, што назіралі за спаборніцтвамі на трыбунах, захочуць запісацца ў секцыю дзюдо, гэта ўжо будзе перамога.

***— Першае, што прыходзіць у галаву, калі кажуць пра спорт на Гомельшчыне, гэта веславанне ў Мазыры, жаночая гандбольная каманда «Гомель» і хакейны «Металург» са Жлобіна. Якія яшчэ віды спорту папулярныя ў рэгіёне?***

— Калі казаць аб масавасці, вядома, гульнявыя віды спорту. Так гістарычна склалася. Калі казаць аб выніках, то — веславанне. Мы не павінны забываць пра сучаснае пяціборства. У нас нядрэнна развіваецца бокс. Дзюдо — адзін з лідараў. На працягу многіх гадоў Гомельская вобласць займае другое месца сярод спартыўнага рэзерву па медалях рознай вартасці пасля Мінска. Вобласць у нас даволі спартыўная. Мы працуем на краіну, працуем на балельшчыка — і гэта абавязкова ў перспектыве дасць запаветны алімпійскі медаль. На сёння ў нашай вобласці сем алімпійскіх чэмпіёнаў. Я думаю, іх будзе больш, у тым ліку і дзякуючы II Гульням краін СНД.

***— Вы ў шматлікіх інтэрв'ю кажаце аб развіцці турызму ў вобласці. На вашу думку, як II Гульні краін СНД паўплывалі на развіццё спартыўнага турызму ў рэгіёне?***

— Адной з мэт правядзення ўсяго спартыўнага форуму была прэзентацыя нашай краіны з турыстычнага пункту гледжання. Палац гульнявых відаў спорту ў Жлобіне дакладна ўваходзіць у топ-5 рэспубліканскіх спартыўных аб'ектаў, нягледзячы на тое што ён знаходзіцца ў раённым цэнтры. Спартсмены, якія туды прыязджаюць, застаюцца ў захапленні. Вышэйшаму спартыўнаму звяну для якаснай падрыхтоўкі неабходныя ўмовы: камфортнае пражыванне, харчаванне, зручная арэна. У Жлобіне ўсё гэта ёсць. Сёння вельмі няпроста трапіць на навучальна-трэніровачны збор у Жлобін, план распісаны надоўга. Фактычна ўсе аб'екты, якія ў нас гатовыя прымаць буйныя старты, загружаныя і задзейнічаныя. І мы рады гасцям, таму што гэта зносіны, зваротная сувязь, абмен вопытам, без чаго немагчымы спорт. Калі ідзе зліццё розных школ, павялічваецца ўзровень спартыўнага майстэрства.

***— Гульні скончацца, а работа працягнецца. На што робіць акцэнт абласное ўпраўленне спорту і турызму?***

— У першую чаргу, на арганізацыю навучальна-трэніровачнага працэсу ў раёнах. Як бы ні было крыўдна абласному цэнтру, асноўны рэзерв усё ж такі ў раёнах. У Гомельскай вобласці будуецца пяць стадыёнаў. І ўсе яны будуць сёлета ўведзены ў эксплуатацыю. Добры стадыён — гэта пачатак развіцця масавага спорту, які з'яўляецца падмуркам пірамiды вялікага спорту.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

*Гомель.*

## Чым парадавалі беларускія лучнікі

# Адзін дзень на стадыёне

**У аўторак на стадыёне «Спартак» у Магілёве было шматлюдна і горача. Спартсмены ў змешаных і групавых спаборніцтвах змагаліся за выхад у фінал. Невялікі спойлер — усе нашы каманды перамаглі!**

Трыбуны на стадыёне вельмі гучныя — балельшчыкі актыўна падтрымліваюць спартсменаў, але ў момант падрыхтоўкі да стрэлу ўсе заціхаюць, бо гэта — момант максімальнай канцэнтрацыі. Кожны стрэл — бура эмоцый.

За права прадставіць нашу краіну ў фінале камандных выступленняў жанчын змагаліся Анастасія Нікіфарэнка, Аляксандра Стралец і Наталля Траццяк. Дзяўчаты перамаглі, а значыць, будуць змагацца за «золата».

«Гэта была безумоўна камандная работа, у нас амаль усё атрымалася, за выключэннем некаторых нюансаў, але так бывае ва ўсіх. Насамрэч — мы малайцы, — падзялілася з журналістамі першымі эмоцыямі **Аляксандра Стралец.** — Вядома, хваляванне было. Не так проста выйсці ды пастраляць. Але гэта больш працоўнае хваляванне. Яно не перашкодзіла нам, а хутчэй дапамагло сабрацца, каб дабіцца сваёй мэты».

**Наталля Траццяк** адзначыла, што барацьба была сур'ёзная, а ўсе сапернікі — моцныя і добра падрыхтаваныя спартсмены. «Мы адразу рыхтаваліся да сур'ёзнай барацьбы», — сказала яна.

Дзяўчаты падкрэслілі, што моцная падтрымка гледачоў — вялікая рэдкасць на спаборніцтвах па стральбе з лука. Па словах Аляксандры Стралец, першапачаткова здавалася, што гучная падтрымка балельшчыкаў можа трохі перашкаджаць, бо спартсменам трэба быць максімальна сабранымі. Але ўсё склалася зусім інакш, эмоцыі балельшчыкаў стымулявалі і дапамагалі. Такая падтрымка — вялікая рэдкасць, падкрэсліла яна.

Канкурэнтам дзяўчат у фінале стане каманда з Расіі. Беларускі нацэленыя паказаць высокія вынікі. Яны без бою не здаюцца, бо не могуць не недаацэньваць сваіх сапернікаў. Трэба змагацца за кожнае ачко, за кожную прабоіну.

Беларуская мужчынская зборная па стральбе з лука, у склад якой увайшлі Антон Цярэта, Цімафей Прылепаў і Станіслаў Барлюгоў, у паўфінальным паядынку атрымала ўпэўненую перамогу над камандай з Узбекістана з лікам 6:0! У фінале яны сустрэнуцца з камандай Расіі

«Шчыра кажучы, былі ўпэўненыя ў перамозе, ішлі мэтанакіравана перамагаць», — падзяліўся ўражаннямі з журналістамі **Антон Цярэта.** — Я думаю, што пераломны момант быў на трэцяй серыі, калі нашы спабornікі пачалі трапляць у «дзясяткі». Але думаю, яны ўсё ж такі не справіліся з хваляваннем. Вельмі прыемна, калі каманду падтрымліваюць нашы ж людзі. Гэта падбадзёрвае і дае ўпэўненасць.

«Надае ўпэўненасці, узнімае сілу духу, калі сваякі, балельшчыкі так актыўна падтрымліваюць нас», — дадаў **Станіслаў Барлюгоў.** Ён расказаў, што ў каманды усё ідзе па плане: «З хлопцамі трэніраваліся, усё атрымалася, як і планавалі. Будзем змагацца да канца, хочам узяць «золата» на гэтых спаборніцтвах».

Для **Цімафея Прылепава** II Гульні краін СНД сталі першымі буйнымі спаборніцтвамі ў яго спартыўным жыцці. «Рады, што яны праходзяць у маім родным горадзе, таму што дома — і сцены памагаюць», — сказаў ён.

Нашы спартсмены адзначылі, што з'яўляюцца не проста камандай, а адным цэлым. І нягледзячы на тое што выступаюць такім складам упершыню, усё роўна яны знайшлі агульную мову і падтрымліваюць адзін аднаго, бо гэта — залог поспеху, а калі ёсць падтрымка, то, несумненна, становішся мацнейшым.

Расійскія спартсмены таксама могуць пахваліцца выдатным вынікам. У паўфінальным паядынку па стральбе з лука зборная Расійскай Федэрацыі аказалася мацнейшай за зборную Азербайджана. У выніку — 5:1 на карысць Расіі. «Нікога не недаацэньваем, усе сапернікі дастойныя. Мы працуем і робім сваю справу, — распавёў журналістам расійскі стралок з лука **Мухібула Махмудаў.** — Арганізацыя на найвышэйшым узроўні, нам вельмі падабаецца ў вас, такое адчуванне, што мы прыехалі на Алімпійскія гульні, вялікі дзякуй за гэта Магілёву».

Гулец расійскай зборнай па стральбе з лука **Сяргей Цярэнаў** адзначыў, што ніколі яшчэ не бачыў столькі людзей, падтрымка балельшчыкаў зараджае на перамогу. Яму вельмі хочацца згуляць з камандай Беларусі.

# «ТАТАМІ — ГЭТА НАША СЦЭНА, НА ЯКОЙ МЫ РАДУЕМ ГЛЕДАЧОЎ»

## Дзюдаісты паказалі максімум, але хацелі б лепшага выніку

**Здаецца, ІІ Гульні краін СНД толькі пачаліся, а ў некаторых відах спорту ўжо разыгралі ўсе медалі, у гонар чэмпіёнаў прагучалі гімны, гледачы парадаваліся перамогам і пажурыліся з-за паражэнняў. Так, у панядзелак скончылася спаборніцкая праграма па дзюдо. Спецыяльна дзеля дзюдаістаў у Гомельскім лядовым палацы спорту лёд змянілі на татамі, на якім з 5 да 7 жніўня кіпела барацьба паміж спартсменамі 2006—2008 гадоў нараджэння з дзевяці краін. Майстры «гібкага шляху» выступалі ў васьмі вагавых катэгорыях сярод юнакоў і дзяўчат. Беларускія спартсмены на татамі не разгубіліся, у скарбонцы гаспадароў турніру адзін сярэбраны і сем бронзавых медалёў.**

Першы медаль для беларускай каманды заваявала **Софія Варапай**, якая стала бронзавым прызёрам у вагавой катэгорыі да 44 кг. **Арына Макеенка** стала сярэбраным прызёрам у катэгорыі да 48 кг. «Зрабіла прыём, але не да канца дацягнула рукамі, саперніца пачала мяне паднімаць — і я ўпала на спіну. Я гэтага не чакала», — растлумачыла сваю памылку спартсменка. Трэцяе месца ў вагавой катэгорыі 63 кг заняла **Эмілія Ксенжык.** Свой медаль спартсменка прысвяціла бацькам. **Ганна Сітнік** таксама заваявала бронзавы медаль у катэгорыі 70 кг. У катэгорыі звыш 70 кг трэцяе месца атрымала **Вікторыя Сузорава.** Медаль яна заваявала ў паядынку супраць сяброўкі па камандзе Дар'і Мішуты. Як адзначыла Вікторыя, выходзіць на татамі супраць калегі па камандзе больш складана, чым супраць незнаёмай саперніцы. У мужчын у вагавой катэгорыі да 90 кг на трэцюю прыступку п'едэстала падняўся **Яўген Марозаў.** Бронзавымі прызёрамі ІІ Гульняў краін СНД сталі таксама **Рыгор Зурначан** (55 кг) і **Мацвей Сычоў** (60 кг).

Праграму па дзюдо закрывалі спаборніцтвы змешаных камандаў. У матчы за трэцяе месца беларусы перамаглі каманду Туркменістана і скончылі ІІ Гульні краін СНД на прыгожай бронзавай ноце. «Мы рады, што да нас прыехалі спартсмены з дзевяці краін, яны заражаныя, мы зараджаныя. А мы засмучаваліся па сапраўднай барацьбе, усімі сіламі стараліся перадолець хваляванне. Хацелася б лепшы вынік», — падкрэсліла трэнер **Таццяна Кунцэвіч.** Аднак нават бронзавы медаль — лепш, чым ніякі.

Для спартсменаў ІІ Гульні краін СНД былі галоўным стартам сезона. Тыя прайшлі некалькі вучэбна-трэніровачных збораў, некалькі адборачных стартаў. Падрыхтоўка была праведзена каласальная, накіраваная толькі на перамогу. Аднак у спорце заўсёды ёсць месца «але». На гэта звярнуў увагу і **Андрэй Казусёнак,**



Фота БелТА.

галоўны трэнер мужчынскай нацыянальнай зборнай па дзюдо. «У асабістых спаборніцтвах, улічваючы, што ў нас адзін сярэбраны і сем бронзавых, хацелася б, каб быў залаты медаль. У катэгорыі 48 кілаграмаў у дзяўчынак і 90 кг у хлопчыкаў мы былі вельмі блізкія да перамогі. Спадзяваліся, але крыху не хапіла. Мы ўзялі колькасцю медалёў і расцягнулі задавальненне для гледачоў. Таму што столькі было прыгожых кідкоў... Усе нацешыліся прыгожым дзюдо», — заўважыў ён.

На ІІ Гульнях краін СНД беларусы выступалі супраць наймацнейшых краін у свеце дзюдо — Расіі, Казахстана, Узбекістана, Азербайджана. І па словах Андрэя Казусёнка, праявілі сябе вельмі дастойна. Таксама ён заўважыў, што ў Гомель прыехалі наймацнейшыя каманды. Асабіста для Андрэя Казусёнка Гульні краін СНД сталі магчымасцю прагледзець рэзерв для нацыянальнай каманды.

«У гэтым узросце ў некаторых спартсменах ужо бачная дарослая барацьба і можна даваць прагнозы, што з такой барацьбой чалавек пойдзе далей. Спартсменаў такога ўзросту можна разглядаць для падрыхтоўкі да наступных Алімпійскіх гульняў. У 2028 годзе ім будзе па 21, працэнтаў 30 спартсменаў заваёўвае медалі на Алімпійскіх гульнях і на чэмпіянатах свету менавіта ў такім узросце. Я таксама стаў прызёрам чэмпіянату свету па дзюдо ў 22 гады. Гэта юнакі, якія ў наступным алімпійскім цыкле будуць прадстаўляць нашу краіну», — адзначыў галоўны трэнер нацыянальнай зборнай.

Як заўважыў **Аляксандр Цімошчык,** старшы трэнер юнацкай зборнай па дзюдо, каманда рыхтавалася на «золата», але атрымалася заваяваць толькі «бронзу». Значыць, па словах трэнера, спартсмены гатовыя на «бронзу». А гэта значыць, што наперадзе ў іх вельмі шмат работы. Але тое будзе пасля невялікага адпачынку. А цяпер самі спартсмены і іх трэнеры шчаслівыя ад таго, што прыгожа выступілі на высокім узроўні, пры цёплай падтрымцы публікі.

«Татамі — гэта наша сцэна, на якой спартсмен робіць сваю справу. Мы стараліся цешыць гледачоў, а яны цешылі нас, за што я ім вельмі ўдзячны», — падкрэсліў Аляксандр Цімошчык.

### РЭПЕТЫЦЫЯ ПЕРАД ГАЛОЎНЫМІ СТАРТАМІ

Спаборніцтвы і асабліва іх прыгожае заканчэнне — эмацыянальны момант не толькі для спартсменаў, але і для кіраўнікоў. Не хаваў сваіх эмоцый і старшыня Беларускай федэрацыі дзюдо **Павел Ясяноўскі.** «Мы бачылі два дні бліскучай бескампраміснай барацьбы на індывідуальных сустрэчах і трэці дзень уражальнай каманднай барацьбы. Такія спаборніцтвы — не толькі складнік барацьбы, але і шанц для ўсіх пазнаёміцца і пасябраваць. Хацелася б, каб наша моладзь пераймала традыцыі, якія былі закладзены дзюдаістамі раней», — падзяліўся ён з журналістамі. Кіраўнік беларускага дзюдо падкрэсліў, што па напружанні на татамі не было розніцы — дарослыя там змагаюцца або кадэцкая група. «Гэтыя спартсмены — заўтрашні дзень нашага дзюдо, моцныя спартсмены, якія прайшлі вельмі доўгі і жорсткі адбор, дабіліся права выступаць і прадстаўляць краіну на ІІ Гульнях краін СНД. Важна згуртаваць каманду, настроіць на работу — гэта тое, што робіць наш трэнерскі штаб, і мы бачым, што ў іх гэта атрымліваецца. Мы ўжо прыступілі да алімпійскага адбору, рашэнне будзе прынята ў кастрычніку. Цяпер нацыянальная каманда рыхтуецца выступаць на турніры ў Баку», — сказаў ён.

Мала хто ведае, што старшыня Гомельскага аблвыканкама **Іван Крупко** займаўся дзюдо. «Глядзець фінал камандаў — адно задавальненне. Тэхніка ў падлеткаў высокая. Прыемна было назіраць за беларусамі. Хацелася, вядома, каб яны пазмагаліся за «золата» з расіянамі. Дзеці таго вартыя», — падзяліўся ён сваімі ўражаннямі. Па словах Івана Крупко, рэгіёну за гонар прымаць дзюдо ў Гомелі, самба ў Жлобіне. «Мы імкнуліся стварыць усе ўмовы, каб паказаць гасцям Беларусь, паказаць Гомельшчыну, нашы турыстычныя магчымасці і тое, што мы можам у спорце. Дзякуючы такому спартыўнаму святу колькасць моладзі, якая займаецца спортам, удвоіцца, утроіцца. А тыя трэнінгі, якія праводзілі алімпійскія чэмпіёны для моладзі, адыграюць сваю ролю ў далейшым развіцці дзюдо як на Гомельшчыне, так і ў цэлым у краіне», — падкрэсліў Іван Крупко.

Майстар-класы ад алімпійскіх чэмпіёнаў сталі яркім і незабыўным элементам спаборніцтваў па дзюдо. Сваім вопытам дзяліўся расійскі дзюдаіст, алімпійскі чэмпіён **Тагір Хайбулаеў.** Ён прызнаўся, што не чакаў убачыць на спаборніцтвах шмат людзей на трыбунах. Але гэта стварае атмасферу свята на турніры. «Цікавасць да ІІ Гульняў краін СНД выкліканая тым, што спаборніцтвы падобныя і да Алімпійскіх гульняў. Шмат відаў спорту, спаборніцтвы праходзяць у розных гарадах. Удзел у такім спаборніцтве для хлопцаў і дзяўчат — гэта рэпетыцыя перад стартамі ўжо ў большым узросце», — падкрэсліў чэмпіён.

Зразумела, што свята дзюдо не магло прайсці і без майстар-класа ад **Ігара Макарава,** адзінага ў Беларусі алімпійскага чэмпіёна па згаданым відзе спорту. Алімпіец нарадзіўся на Гомельшчыне і сёння працуе на радзіме. Ён падкрэсліў, што падобных турніраў па дзюдо ў Гомелі не было ніколі. І гэта абавязкова паўплывае на далейшае развіццё віду спорту ў рэгіёне. «Трыбуны — бачылі? Яны запоўненыя поўнасцю. Спадзяюся, што ўдалося па-сапраўднаму зацікавіць людзей. Мы вельмі старанна рыхтаваліся да гэтага турніру, столькі сіл уклалі, каб усё было і відовішча, і прыгожа. Думаю, нам удалося паказаць, што дзюдо — адзін з самых прыгожых відаў спорту, і яшчэ больш моладзі захоча запісацца ў секцыі па дзюдо», — падзяліўся ўражаннямі Ігар Макараў.

Хто ведае, можа, падчас ІІ Гульняў краін СНД на татамі выйшлі новыя Макаравы ці будучая першая алімпійская чэмпіёнка па дзюдо?

**Валерыя СЦЯЦКО,**
*г. Гомель.*

# «Спартак»

### Спорт — справа сямейная

Не толькі беларусы і расіяне сёння радаваліся сваім поспехам. «Бронза» ІІ Гульняў краін СНД — першая вялікая перамога і чарговы крок да мары для 15-гадовага лучніка з Туркменістана **Эзізмухамета Сахедава.** Спартсмен стаў бронзавым прызёрам спаборніцтваў па стральбе з лука ў індывідуальных заліках сярод мужчын. «На перамогу разлічваў, сёння настрой быў вельмі добры — і я выйграў з лікам 7:1. Больш за ўсё ў гэтай перамозе мне дапамог бацька. Ён вучыў мяне, перадаваў вопыт, дапамагаў, падтрымліваў. Зараджалі эмоцыямі і балельшчыкі — прыемна, калі на трыбунах так перажываюць за спартсменаў. Для мяне гэта першая вялікая перамога і чарговы крок да мары — стаць алімпійскім чэмпіёнам. Для гэтага буду ўзмоцнена трэніравацца і ісці толькі наперад, працаваць на вынік. З маім бацькам і па сумяшчальніцтве трэнерам пакуль яшчэ не вырашылі, як будзем святкаваць перамогу».

Эзізмухамет таксама падзяліўся сваімі ўражаннямі аб нашай краіне: «Мне вельмі падабаецца ў Беларусі, хоць я тут упершыню. Арганізацыя на найвышэйшым узроўні: смачная ежа, выдатны прыём і гасцінныя людзі. Уразіла экскурсія па горадзе — у вас сапраўды вельмі прыгожа. Надвор'е таксама парадавала, у нас, у Туркменістане, нашмат гарачэй».

Сын-пераможца — сапраўдны гонар для бацькі. «Бронза» сына на спаборніцтвах па стральбе з лука на ІІ Гульнях краін СНД для мяне як сон», — распавёў старшыня Нацыянальнай федэрацыі стральбы з лука Туркменістана, галоўны трэнер нацыянальнай зборнай краіны Вепа Сахедаў. «Сапернікі сына нашмат старэйшыя за яго, калі Эзізмухамету ўсяго 15 га-




Фота БелТА.

доў, то астатнім ужо бліжэй да 25. Прагназаваў яму чацвёртае месца, але сын сказаў: «Пакажу сваю сілу і патэнцыял на гэтых спаборніцтвах». Аднак, нягледзячы на мэтанакіраванасць, ён вельмі сціплы хлопец. Я прашу яго не саромецца гаварыць падчас спаборніцтваў, калі што яму не падабаецца. Вядома, я магу быць вельмі эмацыянальным, калі Эзізмухамет страляе: ён хвалюецца, а я — у дзесяць разоў больш. Ён жа не толькі спартсмен, але і мой сын. Я гэтай ноччу дрэнна спаў, усё пракручваў у галаве, разбіраў работу саперніка. А сын, вядома ж, адпачываў, яму неабходны 9-гадзінны сон — тады мацнейшыя нервы і лепшая стральба».

### Найлепшы падарунак для кіраўніка

Толькі станоўчыя эмоцыі адчуваў і старшыня Беларускай федэрацыі стральбы з лука Мікалай Марусаў. «Сёння беларускія лучнікі зрабілі найлепшы падарунак у мой дзень нараджэння — выйшлі ў фінал. Звычайна падарункі дораць увечары, але наша зборная іх ужо паднесла мне, і не адзін: выхад у фінал камандняга заліку ў мужчын і жанчын, а таксама ў мікстах. Вялікі ім дзякуй за гэта. У нашых лучнікаў атрымалася паказаць тое, над чым мы працавалі ўсе папярэднія месяцы і гады. Я іх люблю!» — прызнаўся старшыня федэрацыі. Пры гэтым ён падкрэсліў, што праца камандна гэтым не скончылася, бо галоўны бой яшчэ наперадзе, таму пакуль ніхто не расслабляецца.

«Вядома ж, медаль ужо ёсць, але паверце, ніводнага спартсмена не задавальняе другое месца, нават калі гэта «серабро» Алімпійскіх гульняў або чэмпіянату свету. Значыць, дзесьці недапрацавалі. Усе хочуць перамогі, таму і ў беларускай зборнай настрой толькі адзін — залаты медаль».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
*г. Магілёў.*

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Карысна ведаць

# Як западозрыць утварэнне тромба?

**Трамбоз — гэта небяспечны стан, які нярэдка пагражае жыццю, бо крывяны згустак цалкам або часткова перакрывае вену. Пры адрыве тромба магчыма ўзнікненне тромбаэмбаліі, калі згустак трапляе ў лёгкае, выклікаючы небяспечныя наступствы. Адрыў тромба і яго трапляннне з цячэннем крыві ў сэрца правакуе інфаркт. Пападаючы ў мозг, згустак выклікае інсульт. Такім чынам, трамбоз можа прывесці не толькі да паралічу, але нават да смерці.**
**На жаль, трамбоз — распаўсюджанае захворванне, якое сустракаецца ў 10 % дарослага насельніцтва. Да паловы выпадкаў трамбозу і тромбафлебіту звязана з ходам варыкознай хваробы. Хранічная вянозная недастатковасць становіцца прычынай інваліднасці ўжо праз тры гады пасля пачатку ўтварэння тромбаў.**



## СІМПТОМЫ

Часцей за ўсё пры захворванні церпяць сасуды галёнкі. З-за ўтварэння тромба звужаецца прасвет сасуда, парушаецца крывазварот і трофіка тканак. Калі працэс працяглы час застаецца без увагі, можа ўтварыцца некроз. Сімптомы трамбозу глыбокіх вен канечнасцяў часам немагчыма распазнаць, бо хвароба не дае вонкавых прыкмет, а дыскамфорт людзі ігнаруюць. Першая прыкмета, на якую варта звярнуць увагу, гэта змена колеру і тэкстуры скурных покрываў, ацёчнасць ног.

**Вось асноўныя сімптомы трамбозу глыбокіх вен ніжніх канечнасцяў:**
- скура на нагах становіцца глянцавай і бледнай ці сінюшнай;
- у залежнасці ад месца ўтварэння згустка можа ацячы галёнка, сцягно, шчыкалатка. Часам прыпухае ўся нага;
- балючасць канечнасці;
- парушэнне рухомасці;
- цяжар або скаванасць;
- ушчыльненне сасудаў.

Па меры прагрэсіравання захворвання ўзмацняюцца болевыя адчуванні.

Часам сімптомы трамбозу глыбокіх вен ніжніх канечнасцяў выяўляюцца раптоўна: раніцай нага рэзка ацякае, перашкаджаючы падняцца з ложка. Такі стан найбольш небяспечны, бо следам можа пачацца эмбалія і закупорванне лёгкага. Калі ацёчнасць суправаджаецца павышэннем тэмпературы і болем у грудзях, патрабуецца неадкладная медыцынская дапамога. Працяглае парушэнне кровазвароту прыводзіць да адмірання тканак — гангрэны.

Аднак сімптомы трамбозу глыбокай вены галёнкі або сцягна на ранніх стадыях неспецыфічныя і могуць быць вынікам іншых захворванняў. Паколькі распазнаць трамбоз глыбокіх вен можна толькі пасля дыягнастыкі, лепш звярнуцца да ўрача для высвятлення дакладнага дыягназу.

## ПРЫЧЫНЫ ТРАМБОЗУ ГЛЫБОКІХ ВЕН

Перад тым як лячыць трамбоз глыбокіх вен, неабходна ўстанавіць прычыну паталогіі. З такой мэтай праводзяцца розныя даследаванні. Да асноўных прычын трамбозу глыбокіх вен ніжніх канечнасцяў адносіцца застой крыві, які можа быць выкліканы шэрагам фактараў. Прычыны ўзнікнення трамбозу глыбокіх вен:
- лішняя вага;
- вельмі высокі і, наадварот, нізкі рост;
- захворванні крыві (павышаная згусальнасць);
- спадчынная схільнасць;
- выкарыстанне аральнай гарманальнай кантрацэпцыі;
- малая фізічная актыўнасць;
- працяглая нерухомасць (на працягу чатырох і больш гадзін);
- павышэнне сасудзістага ціску з прычыны цяжарнасці;
- курэнне;
- траўмы і аперацыі;
- інфекцыйныя захворванні;
- пажылы ўзрост;
- анкалогія;
- хваробы печані;
- аўтаімунныя захворванні.

Сімптомы трамбозу глыбокіх вен нагі нярэдка праяўляюцца ў ляжачых хворых. Таксама быў праведзены шэраг даследаванняў аб наяўнасці сувязі паміж захворваннем і частатой паездак — як авіяпералётаў, так і падарожжаў наземным транспартам.

Пол таксама ўплывае на тое, як выяўляецца трамбоз глыбокіх вен. Часцей ён сустракаецца ў жанчын: колькасць пацыентак складае 66 %. Пры гэтым сярэдні ўзрост хворых абодвух полаў — 46 гадоў.

## КАБ ВЫЗНАЧЫЦЬ...

Існуе мноства методык, як дыягнаставаць трамбоз глыбокіх вен. Вопытны флеболаг можа зрабіць папярэдняе заключэнне па клінічнай карціне. Першым чынам, збор анамнезу і аналіз крыві (на D-дымер) дазволяць урачу зрабіць папярэдняе заключэнне. Для атрымання дакладных даных аб стане вен робяць дуплекснае сканіраванне, флебаграфію (ангіяграфію вен). Гэта дапамагае ўстанавіць лакалізацыю і працяглась тромба, ацаніць хуткасць кровазвароту і стан сценак сасудаў.

## ЯК ЛЕЧЫЦЦА?

Толькі паўнавартаснае абследаванне дапамагае вызначыцца з лячэбнай тактыкай. Мерапрыемствы па знішчэнні тромбаў уключаюць як кансерватыўную тэрапію, так і непасрэднае выдаленне тромба рознымі спосабамі. Важна аднавіць парушаны кровазварот, ліквідаваць запаленне, прадухіліць паўторнае ўтварэнне. З малаінвазійных метадаў шырока ўжываецца тромбаэктамія — аперацыя па выдаленні тромба, як традыцыйным хірургічным спосабам, так і з дапамогай эндаваскулярнай хірургіі, а таксама лазерам. Праводзіцца ангіяпластыка — расшырэнне прасвету за кошт катэтара. Да стэнціравання звяртаюцца з мэтай прадухілення паўторнага звужэння вены.

Скажыце, доктар...

# ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ЎКУСІЎ САБАКА?

**Лета — перыяд доўгіх канікулаў, калі дзеці шмат часу праводзяць на свежым паветры, выязджаюць з гарадоў у вёскі ці дачныя пасёлкі. І выпадкі, калі дзіця гуляе ці гладзіць хатнюю або нават дзікую жывёлу, становяцца нярэдкімі. Такія кантакты могуць скончыцца сумна — пасля ўкусу чатырохногага можа спатрэбіцца курс уколаў.**
**Калі вас укусіў сабака, першае, што трэба зрабіць, гэта звярнуцца па медыцынскую дапамогу. Няважна, была тая жывёла хатняя ці бадзяжная. Беспадстаўная агрэсія з'яўляецца толькі ў хворых сабак, у астатніх выпадках яна матываваная. Як сябе паводзіць дзецям і іх бацькам у такіх выпадках, расказала загадчыца 2-га педыятрычнага аддзялення 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Аксана ГАНЧАР.**

## У чым галоўная небяспека?

— Пры ўкусе сабакі, як, зрэшты, і іншай жывёлы — лісіцы, ваверкі, кошкі — неабходна адразу ж звярнуцца да ўрача, траўматолага ці хірурга. Чаму? Па-першае, раны неабходна апрацаваць, у шэрагу выпадкаў — накласці шво, прызначыць адпаведнае лячэнне, што можа зрабіць толькі спецыяліст. Па-другое, небяспечны не толькі ўкус, але і сліна на скурных, слізістых покрывах, асабліва калі на іх маюцца мікратраўмы. Са слінай жывёл чалавеку можа перадацца вірус такога небяспечнага захворвання, як шаленства, — расказвае ўрач.

Шаленства — інфекцыйная хвароба з пераважным пашкоджваннем нервовай сістэмы, якое суправаджаецца сутаргамі, спазмамі глотачнай і дыхальнай мускулатуры, што прыводзіць да смерці, калі не прыняць адпаведных мер.

На шаленства часцей хварэюць дзікія жывёлы — ваўкі, лісы, яноты, ваверкі, барсукі, мядзведзі і іншыя. Ад іх пры ўкусе заражаюцца хатнія жывёлы і людзі. Сярод людзей захворванне на шаленства распаўсюджваюць звычайна хатнія жывёлы. Асабліва небяспечныя бадзяжныя сабакі і кошкі.

Хатнія жывёлы могуць заразіцца ад дзікіх жывёл і адна ад адной. Як адзначае доктар, у апошні час самай частай крыніцай распаўсюджвання хваробы сталі лісы і ваверкі.

Пры ўкусе хворай жывёлы разам са слінай вірус трапляе ў рану. Вельмі небяспечнае трапляннне сліны на слізістыя абалонкі вачэй, рота, носа, а таксама на скуру, дзе могуць быць нябачныя вокам пашкоджанні — мікратраўмы.



## Як западозрыць шаленства ў гадаванца?

Прыкметы шаленства ў жывёл вельмі разнастайныя. Так, у сабак і катоў хвароба працякае ў дзвюх формах: бурнай і ціхай.

Жывёла з бурнай формай становіцца агрэсіўнай, мяняе месца пасялення, уцякае з хаты, грызе неядомыя прадметы, сіпне або зусім змаўкае, адмаўляецца ад ежы і вады, не слухае гаспадара, паходка становіцца хісткай, адвісае ніжняя сківіца, выдзяляецца сліна. Сабака моўчкі, без брэху, можа накінуцца на сустрэчных і ўкусіць.

Найбольш небяспечная ціхая форма шаленства, пры якой асноўныя прыкметы праяўляюцца слаба, яе позна распазнаюць, і неабходныя меры засцярогі своечасова не прымаюцца.

## Першыя дзеянні пры ўкусе

— Чалавек заражаецца пры трапляннi віруса шаленства са слінай хворай жывёлы праз рану пры ўкусе, а таксама пры трапляннi сліны на скуру і слізістыя. Вельмі небяспечныя драпіны, нанесеныя кіпцюрамі: жывёлы часта ліжуць лапы, таму на кіпцюрах застаецца пэўная колькасць узбуджальніка хваробы, дастатковая для заражэння. Пры ўсіх падобных кантактах з жывёламі неабходна прамыць рану ці драпіну вялікай колькасцю праточнай вады з мылам, пажадана гаспадарчым; апрацаваць раны ёднай настойкай; накласці стэрыльную павязку; неадкладна звярнуцца ў медыцынскую ўстанову, — рэкамендуе Аксана Ганчар.

Калі ўсё ж чалавек заразіўся вірусам шаленства, то першыя клінічныя сімптомы хваробы могуць праявіцца пасля інкубацыйнага перыяду, які вар'іруецца ад 1-2 тыдняў да 12 месяцаў і больш.

Першыя клінічныя сімптомы — пачуццё разбітасці, галаўны боль, павышэнне тэмпературы, млоснасць, ваніты. Паволі з'яўляюцца пачуццё трывогі, болю, паколванне і сверб у зоне ўкусу.

А вось далей з'яўляецца вадабоязь — балючыя сутаргавыя скарачэнні мышцаў глоткі і гартані пры спробе піць ваду, пры выглядзе вады і гуку таго, як льецца вада. Смерць надыходзіць ад удушша.

Каб пазбегнуць такой небяспечнай інфекцыі, неабходна памятаць і выконваць меры прафілактыкі і засцярогі ад шаленства. У прыватнасці, пазбягаць кантактаў з дзікімі і бяздомнымі хатнімі жывёламі, тлумачыць гэта дзецям, праяўляць насцярожанасць у выпадку неадэкватных паводзін хатняй жывёлы і паведамляць аб тым у санітарную службу.

Не варта забіваць хатнюю жывёлу, якая пакусала і падрапала чалавека, — за ёй павінна быць устаноўлена 10-дзённае назіранне санітарнай службай.

## Адзіны спосаб пазбегнуць хваробы — прышчэпка

Прышчэпкі ад шаленства — у цяперашні час адзіны спосаб, які прадухіляе грознае захворванне. Курс прышчэпак — шэсць ін'екцый, прычым важнае іх своечасовае правядзенне ў адпаведнасці з прызначэннем урача па вызначанай схеме. Ні ў якім разе нельга самавольна перапыняць вакцынацыю або несвоечасова рабіць прышчэпкі, бо ў такім выпадку яны будуць неэфектыўныя. Кожны прапушчаны дзень — пагроза для жыцця.

Варта падумаць і пра здароўе сваіх хатніх гадаванцаў, з дапамогай прафілактычных прышчэпак абараняць іх, а з імі і сябе, ад розных інфекцый, у тым ліку шаленства.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

9 жніўня 2023 г. № 28 (714)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


НА КАНТРОЛІ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

# ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ ПУСТЫХ ПАБУДОЎ







## На выязным пасяджэнні прэзідыума Брэсцкага абласнога Савета абмеркавалі выкарыстанне аб'ектаў камунальнай маёмасці, прададзеных у свой час за адну базавую велічыню

**НАВЯДЗЕННЕ парадку на зямлі з дапамогай прыцягнення ў абарот маёмасці, якая не выкарыстоўвалася, пачалося ў далёкім ужо 2006 годзе. Да той пары на Брэстчыне было назапашана шмат нерухомасці, што зрабілася баластам на рахунках балансатрымальнікаў. Таму Указ № 108 за 27 лютага 2007 года «Аб некаторых мерах па прыцягненні ў гаспадарчы абарот дзяржмаёмасці, якая не выкарыстоўваецца» сустрэлі з пэўным энтузіязмам. Многія пустуючыя будынкі пачалі знаходзіць новых гаспадароў.**

### Жылы дом, буйная вытворчасць, рытуальнае агенцтва...

Пачынаючы з 2008 года за адну базавую ў вобласці прадалі 665 аб'ектаў. Варта сказаць, што не ўсім гэтым аб'ектам пашанцавала з пакупнікамі. Але ў 320 выпадках здзелкі аказаліся ўдалымі. Аб'екты ў іх новым аблічы працягваюць служыць людзям. Некаторыя з такіх у Пружанскім раёне наведалі ўдзельнікі выязнога пасяджэння прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў. Пасля агляду на пленарным пасяджэнні члены прэзідыума аблсавета, старшыні раённых і гарадскіх Саветаў абмеркавалі праблемы выканання ўмоў продажу дзяржмаёмасці на таргах за адну базавую велічыню, гаварылі таксама аб набытках і падводных камянях важнай дзяржаўнай кампаніі.

Першым аб'ектам наведвання стаў шматкватэрны жылы дом з убудавана-прыбудаванымі гандлёвымі і адміністрацыйнымі памяшканнямі на вуліцы Заводскай у Пружанах. На аўкцыёне ў 2017 годзе будынак набыло прыватнае прадпрыемства «ШэрманТры». Умовамі продажу стала перапрафіляванне аб'екта ў жылы дом, а таксама завяршэнне рэканструкцыі аб'екта і ўвод у эксплуатацыю. Удзельнікі мерапрыемства ацанілі маштаб праведзеных работ, адзначылі выгаднае месцазнаходжанне аб'екта, зручнасць для жыхароў у плане наяўнасці на першым паверсе магазінаў і гандлёвых павільёнаў.

*(Заканчэнне на 9-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## У фармаце адкрытага дыялогу

### Сенатары пастаянна на сувязі



11 жніўня з 10.00 да 13.00 **намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Валерый БЕЛЬСКІ** правядзе асабістыя прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб.

Прыём пройдзе па адрасе: г. Мінск, вул. Кірава, д. 47.

Асабісты прыём будзе весціся па папярэднім запісе па тэлефоне 8 (017) 328-53-24.

Запіс на прыём ажыццяўляецца таксама шляхам накіравання ў Савет Рэспублікі пісьмовага звароту па адрасе: 220016, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 9.

***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Алег РАМАНАЎ** узяў удзел у сустрэчы з працоўным калектывам ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк».

Алег Раманаў азнаёміў прысутных з асноўнымі палажэннямі Статута і праграмай Беларускай партыі «Белая Русь», абазначыў задачы, якія з'яўляюцца ключавымі ў дзейнасці партыі. Таксама расказаў аб асноўных этапах фарміравання арганізацыйнай структуры партыі.

Падчас дыялогу ўдзельнікі сустрэчы задавалі пытанні парламентарыю таксама аб дзейнасці аднайменнага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання, аб акцыях і праектах, якія праводзяцца.

***

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, дырэктар сярэдняй школы № 14 г. Маладзечна Каліна КАПУЦКАЯ** правяла асабісты прыём грамадзян Маладзечна і Маладзечанскага раёна.

Заяўнікі звярнуліся да сенатара з рознымі пытаннямі: добраўпарадкаванне тэрыторыі каля «Сцяны Памяці» на вул. Валынца, аказанне дапамогі ў ацэнцы жылога фонду для наступнай змены ўласніка, добраўпарадкаванне месца рэалізацыі лішкаў сельгаспрадукцыі з асабістых прысядзібных участкаў на вул. Крынічная.

Усе звароты ўзятыя пад асабісты кантроль сенатара.

***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар дзяржаўнай установы «Гомельаблпрам» Аляксей НЯВЕРАЎ** правёў прамую тэлефонную лінію і асабісты прыём грамадзян.

Да сенатара звярнуліся па пытаннях выканання правілаў гандлю, адсутнасці пэўнага медыцынскага прэпарату ў аптэчнай сетцы Гомеля, адсутнасці электронных інфармацыйных табло на прыпынках грамадскага транспарту (па вул. Інтэрнацыянальнай і праспл. Леніна ў Гомелі), а таксама са скаргай на неякаснае абслугоўванне пасажыраў у маршрутных таксі міжгародніх зносін.

«Усе агучаныя факты будуць дэталёва разгледжаны, па магчымасці акажам усебаковую дапамогу ў вырашэнні ўзнятых праблем, у тым ліку праз прадстаўнікоў мясцовых органаў улады, кампетэнтных службовых асоб», — адзначыў Аляксей Нявераў.

Кожны са зваротаў узяты парламентарыем на асабісты кантроль. Ва ўстаноўленыя заканадаўствам тэрміны грамадзянам будуць дадзены пісьмовыя тлумачэнні.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

БУДНІ СЕНАТАРА

# 24 ГАДЗІНЫ Ў СУТКІ НА СУВЯЗІ

## Алег Дзячэнка пра работу ў акрузе, навуковы падыход і ўзаемадзеянне з моладдзю

**Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт Алег ДЗЯЧЭНКА з'яўляецца членам Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці ад Магілёўскай вобласці, узначальвае Акадэмію паслядыпломнай адукацыі. Яго лёс вызначыла прафесія настаўніка, якую нельга ўявіць без цеснага ўзаемадзеяння з людзьмі, моладдзю. У сваёй дзейнасці — і працоўнай, і грамадскай — ён ставіць акцэнт на выхаванні падрастаючага пакалення, захаванні гістарычных традыцый, умацаванні міжнацыянальных і міжнародных зносін. Падчас сёлетняга X Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі ва Уфе ён удзельнічаў у падпісанні пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі і дзяржаўнай аўтаномнай установай дадатковай прафесійнай адукацыі Рэспублікі Башкартастан. І наша размова пачалася менавіта з гэтага.**



— Пагадненне аб супрацоўніцтве падпісана ў рамках рэалізацыі выніковага дакумента IX Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які праходзіў летась у Гродне, — падкрэсліў сенатар. — У нас быў час прыглядзецца адзін да аднаго, ацаніць магчымасці і вырашыць на доўгатэрміновае супрацоўніцтва. Яно датычыцца няспыннай педагагічнай адукацыі і адукацыі дарослых. Таго, чым непасрэдна займаецца наша акадэмія. Абодва бакі маюць намер абменьвацца інфармацыйна-аналітычнымі матэрыяламі, вучэбна-метадычнай дакументацыяй, вопытам эфектыўнай работы. Плануем таксама рэалізоўваць сумесныя праграмы і праекты, арганізоўваць і праводзіць навуковыя мерапрыемствы, у тым ліку ў дыстанцыйнай форме, узаемадзейнічаць па ўсіх без выключэння кірунках. Акадэмія, рэктарам якой я з'яўляюся, працуе па трох асноўных. Мы ажыццяўляем праграмы павышэння кваліфікацыі, перападрыхтоўкі і стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі. У сярэднім іх асвойвае штогод звыш сямі тысяч чалавек. Для жадаючых атрымаць «новую» адукацыю прапануем праграмы перападрыхтоўкі, у тым ліку ў дыстанцыйнай форме. Напрыклад, асобам, якія не маюць дыплома педагога, сёлета дадзена магчымасць прайсці перападрыхтоўку па спецыяльнасці «Педагагічная дзейнасць». Акадэмія таксама з'яўляецца каардынатарам па інавацыйным і навукова-метадычным забеспячэнні дзейнасці ўстаноў адукацыі, духоўна-маральным, патрыятычным і ваенна-патрыятычным выхаванні навучэнцаў, сацыяльна-педагагічнай рабоце і ахове дзяцінства, па рэалізацыі праграмы бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі. Мы забяспечваем арганізацыйна-метадычнае суправаджэнне рэспубліканскіх конкурсаў прафмайстэрства педработнікаў «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь», «Сучасныя тэхналогіі ў спецыяльнай адукацыі», «Я — даследчык» для дашкалят, рэспубліканскага фестывалю «Педагагічны дэбют» і іншых. Акрамя таго, праводзім сацыялагічныя даследаванні, розныя тэматычныя семінары, лекторыі, навучальныя курсы, іншыя адукацыйныя і метадычныя мерапрыемствы, у якіх штогод удзельнічае звыш 11 тысяч чалавек.

***— Ваша работа — перадусім з людзьмі. Наколькі вы даступны чалавек?***

— Акрамя традыцыйных асабістых і выязных прыёмаў грамадзян, тэлефонных прыёмаў і сустрэч у працоўных калектывах карыстаюся для зносін сацыяльнымі сеткамі. Праз акаўнт у «Фэйсбуку» і вэб-сайт Djachenko.by інфармую насельніцтва аб праведзенай сенатарскай рабоце і падтрымліваю зваротную сувязь у рэжыме, як той казаў, 24/7.

У рабоце са зваротамі грамадзян няма дробязяў. Тут важныя ўсе пытанні: ад добраўпарадкавання тэрыторый, могілак, рамонту дарог, забеспячэння вадой да вырашэння спрэчных юрыдычных праблем, звязаных з прымяненнем заканадаўства. Са свайго досведу прывяду характэрны прыклад.

З жыллёвай праблемай звярнулася да мяне жыхарка Магілёва. Яе прыватнае домаўладанне падлягала зносу, паколькі на зямельным участку планавалася будаўніцтва новага шматкватэрнага жылога дома. Пераязджаць у выдзеленую ў якасці кампенсацыі кватэру сям'я катэгарычна адмовілася. Што рабіць у такой сітуацыі? Як дапамагчы чалавеку? Высветлілася, што ўлады могуць даць сям'і жылы аднакватэрны дом, але для гэтага неабходна прыняць шэраг рашэнняў. Пасля юрыдычнай прапрацоўкі пытання было прынята рашэнне ў інтарэсах грамадзянкі.

Дарэчы, звяртаюцца жыхары не толькі маёй акругі — Магілёўскага і Чавускага раёнаў вобласці, — але і іншых рэгіёнаў, у тым ліку Магілёва і Мінска. Калі ёсць магчымасць у рамках заканадаўства вырашыць тое ці іншае пытанне — стараюся дапамагчы, калі не — тлумачу, чаму.



Прыём грамадзян — неад'емная частка работы сенатара.

***— Якія тэмы ўзнімаеце на сустрэчах і дыялогавых пляцоўках у працоўных калектывах, з насельніцтвам, моладдзю?***

— Сярод тэм, якія абмяркоўваюцца, — заканатворчая дзейнасць Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, развіццё сучаснай грамадска-палітычнай сітуацыі, экстрэмізм і нацызм, а таксама гісторыя іх узнікнення і барацьба з праявамі гэтай небяспечнай з'явы ў сучасным грамадстве, узаемадзеянне ўстаноў адукацыі з Беларускай праваслаўнай царквой па пытаннях патрыятычнага выхавання моладзі, рэалізацыя рашэнняў VI Усебеларускага народнага сходу, патрыятычнае выхаванне і рэалізацыя дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, ідэалагічная работа ў сучасных умовах, захаванне гістарычнай памяці і ўвекавечанне імёнаў герояў вайны і ветэранаў працы і іншыя. Тэм настолькі шмат, што іх цяжка пералічыць.

Вельмі актуальныя сёння пытанні міжнароднай абстаноўкі. Паглядзіце, як абвастрыліся глабальныя праблемы чалавецтва. Адна эпідэмія COVID-19 чаго вартая. З кожным днём абвастраецца ваенная эскалацыя на нашых паўднёвых граніцах. Недружалюбныя нам дзяржавы напампоўваюць краіны Балтыі, Польшчу і Украіну цяжкім узбраеннем, воінскім кантынгентам, нарошчваюць шчодрую ваенную і эканамічную дапамогу кіеўскаму рэжыму, усімі спосабамі абвастраюць канфліктную сітуацыю ва Усходнееўрапейскім рэгіёне. Мы павінны ўлічваць гэты сумны вопыт і ва ўмовах новага геапалітычнага перадзелу свету, узрастання агрэсіўнасці Паўночнаатлантычнага ваенна-палітычнага блока забяспечваць бяспеку беларускай дзяржавы, стымуляваць рост эканомікі, захоўваць грамадзянскі мір і згоду ў грамадстве. Як сказаў наш Прэзідэнт, кожны беларус павінен быць грамадзянінам і патрыётам, добрасумленна выконваць свае прафесійныя абавязкі і ўносіць свой уклад у агульную справу абароны нацыянальных інтарэсаў.

***— Што, на ваш погляд, неабходна для захавання гістарычнай памяці і фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў?***

— Мы павінны выключыць любыя спробы пад выглядам навуковых ці іншых дыскусій пераглядзець падзеі не толькі Вялікай Айчыннай вайны, але і ўсёй тысячагадовай гісторыі беларускага народа. Гістарычны рэвізіянізм недапушчальны ва ўсіх формах свайго праяўлення.

Гістарычная праблематыка сёння на парадку дня. Да мяне неаднаразова на прамую тэлефонную лінію звярталіся ініцыятыўныя грамадзяне, якія прасілі аб садзейнічанні ва ўвекавечанні памяці тых ці іншых гістарычных асоб або гераічных падзей мінулага. Летась завяршылася эпапея з устанаўленнем у Шклове Магілёўскай вобласці помніка расійскаму дзяржаўнаму дзеячу Апалону Крывашэіну. Помнік быў зроблены на сродкі расійскага мецэната беларускага паходжання. Аднак з-за прававых калізій, кадравых ратацый у раёне і дыскусій адносна выбару месца для рэалізацыі праекта спатрэбілася дзесяць гадоў.

Між тым асоба Апалона Крывашэіна значная не толькі для Шклоўскага раёна, але і для ўсяго Усходне-Беларускага рэгіёна. Мяркуйце самі. У царскай Расіі ён займаў пасаду міністра шляхоў зносін. Менавіта пры ім быў распрацаваны план Кіева-Пецярбургскай чыгункі, праведзена чыгуначная ветка «Магілёў — Орша» і спраектавана станцыя Шклоў. У сваім маёнтку ён пабудаваў фабрыку па вытворчасці паперы, якая цяпер дзейнічае пад назвай ААТ «Папяровая фабрыка «Спартак». Па яго ініцыятыве ў 1902 годзе ў Шклове быў закладзены парк пейзажнага тыпу, які стаў помнікам садова-паркавага мастацтва.

У рамках маштабнай работы па захаванні гістарычнай памяці нельга не сказаць аб пошукавай дзейнасці, звязанай з увекавечаннем імёнаў ахвяр генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Працуючы з дакументамі ў адным з архіваў Магілёва, я ўстанавіў імёны жыхароў невялікай вёскі ў Магілёўскім раёне, якія былі спаленыя нямецка-фашысцкімі акупантамі ў ліпені 1943 года. Збіраюцца і публікуюцца матэрыялы аб земляках, што бралі актыўны ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне і ў так званых лакальных войнах 1939—1940 гадоў. І наш святы абавязак — аднавіць сацыяльную і гістарычную справядлівасць, устанавіць па меры магчымасці імёны ўсіх, хто абараняў інтарэсы працоўнага народа. Тым самым мы не толькі захаваем памяць пра герояў вайны, але і нададзім магутны імпульс працэсу грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі, захаванню шматвяковых традыцый, папулярызацыі традыцыйных каштоўнасцяў і гісторыка-культурнай спадчыны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Дарэчы

### «Наглядны прыклад народнай дыпламатыі ў дзеянні»

**Выказаўся Алег Дзячэнка і наконт яркай спартыўнай падзеі, якой гэтымі днямі жыве ўся краіна:**

— У Год міру і стваральнай працы Беларусь праводзіць II Гульні краін СНД па дваццаці відах спорту. Гэта не толькі пачэсна, але і палітычна глыбока сімвалічна. Удзельнікі спартыўных спаборніцтваў, якія прыбылі ў нашу краіну, назіральнікі, балельшчыкі і турысты змаглі адчуць вялікую ўвагу і падтрымку, што аказвае дзяржава спартыўнай супольнасці, інвестуючы значныя фінансавыя сродкі ў будаўніцтва сучасных спартыўных аб'ектаў, стымулюючы развіццё масавай фізкультуры і спорту, садзейнічаючы тым самым больш шырокаму ўкараненню ў штодзённае жыццё людзей. Усё даступна і прывабна, ад дваровага варкаўту да буйных спартыўных збудаванняў і фізкультурна-аздараўленчых комплексаў.

І ў забеспячэнні ўмоў правядзення саміх Гульняў вытрыманы высокія стандарты. Не толькі ў сталіцы і ў абласных цэнтрах, але і ў раённых гарадах — у Жлобіне, Маладзечне, Оршы і Салігорску.

Нашы замежныя госці на свае вочы пераканаліся, што залогам усяму з'яўляецца грамадска-палітычная стабільнасць і эканамічная ўстойлівасць беларускага грамадства. Наглядны прыклад народнай дыпламатыі ў дзеянні.

II Гульні краін СНД умацавалі салідарнасць краін Садружнасці і прадэманстравалі ўсім краінам міралюбівы знешнепалітычны курс Беларусі, накіраваны на нармальнае суіснаванне дзяржаў з розным сацыяльным укладам, гістарычнымі і нацыянальнымі традыцыямі.

# ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ ПУСТЫХ ПАБУДОЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Удзельнікі мерапрыемства таксама наведалі прадпрыемства «Рытуал Сэрвіс», якое з'явілася на месцы былой сталоўкі завода радыёдэталяў. Індывідуальныя прадпрымальнікі — сужэнцы Бондары — стварылі новыя рабочыя месцы і аказваюць увесь комплекс рытуальных паслуг — ад арганізацыі развітання з памерлым у спецыяльна створаный зале да вырабу і ўстаноўкі помніка. У планах значыцца абсталяванне памяшкання для правядзення памінальных абедаў.

Цэхі былога завода радыёдэталяў сталі вытворчай базай сучаснага прадпрыемства ТАА «Нятканы свет». Яго дырэктар Алег Гіль расказаў наведвальнікам, што сёння тут працуюць 112 чалавек. «Нятканы свет» стаў пастаўшчыком для такіх вядомых брэндаў, як «Аскона», «Арматэк», актыўна працуе з Расіяй, вытрымліваючы вялікую канкурэнцыю; валокны з Пружан купляюць вытворцы Шры-Ланкі, Індыі, В'етнама. Цяпер, акрамя палотнаў, валакна, вырабляюць яшчэ тэрмалямец, медыцынскія маскі, рэспіратары, іншую прадукцыю — асартымент даволі шырокі.

Побач з Ружанамі дэпутаты наведалі аграсядзібу «Залаты Фазан», пачаткам якой таксама стаў аўкцыён па продажы аб'екта за адну базавую велічыню. Гаспадар сядзібы Валерый Ланшакоў, аматар жывёл і птушак, стварыў тут цікавы заалагічны аб'ект. Алені, ланi, яноты, лісы, рознае птаства сталі насельнікамі заасада. Паглядзець на жывёл, паслухаць птушыныя сімфоніі прыязджаюць адпачывальнікі з санаторыя «Ружанскі», ахвотна едуць у Малочкі школьныя экскурсіі. А будынак былой школы з назвай вёскі, куплены за адну базавую, адрамантаваны і служыць кавярняй для турыстаў.

## З гісторыі пытання

**Намеснік старшыні камітэта дзяржаўнай маёмасці Брэсцкага аблвыканкама Надзея СТРАЛЬЦОВА** падрабязна азнаёміла ўдзельнікаў нарады са станам спраў у азначаным кірунку. Надзея Мікалаеўна спынілася на гісторыі пытання, якая ў пэўнай меры стала адлюстраваннем змяненняў у заканадаўстве. Паводле яе слоў, пачынаючы з 2008 года і заканчваючы 2012 годам, штогод заключалася па 20-30 дагавораў продажу. У 2012 годзе нормы, якія рэгулююць такі спосаб продажу, былі перанесены ва Указ № 294 са значным пашырэннем магчымасцяў пакупніка. Напрыклад, не прададзеную для прадпрымальніцтва маёмасць стала магчыма набыць фізічным асобам пад жыллё альбо для вядзення падсобнай гаспадаркі, дазволены знос некаторых аб'ектаў і будаўніцтва новых. Была выключана з умоў неабходнасць стварэння рабочых месцаў. Акрамя таго, мясцовыя ўлады атрымалі права прадаваць аб'ект за базавую без праходжання этапаў паніжэння цаны на 20, 50, 80 працэнтаў. Таму лагічным выглядае ўсплёск продажаў у 2015—2016 гадах. Але ж «на хвалі» новымі ўласнікамі сталі і тыя, хто яўна не разлічыў свае сілы. У выніку некаторыя атрымалі немалыя штрафы і падпісанні вярнуць маёмасць дзяржаве. Гэты вопыт крыху астудзіў запал асобных грамадзян, і, як вынік, колькасць продажаў скарацілася ўдвая.

## Узрастанне ролі мясцовых Саветаў

Як вядома, у сакавіку бягучага года ўступіў у сілу Указ № 330 «Аб распараджэнні маёмасцю», якім істотна ўзмоцнена роля мясцовых Саветаў дэпутатаў. Зараз яны могуць устанаўліваць і мяняць абавязковыя ўмовы продажу, працягваць тэрміны іх выканання, а таксама мяняць альбо вызваляць ад штрафаў пакупніка за невыкананне абавязацельстваў. Такім чынам, на сваім узроўні яны змогуць знаходзіць кампрамісныя рашэнні, улічваючы інтарэсы рэгіёна і пакупнікоў, аператыўна ўплываць на вырашэнне праблемных сітуацый.

— Пасля таргоў узаемаадносіны выканкамаў, камунальных прадаўцоў і пакупнікоў набываюць абароты, — адзначыла Надзея Стральцова. — Да абследавання аб'ектаў падключаюцца камісіі, створаныя пры выканкамах, у склад якіх уваходзяць дэпутаты. У шэрагу раёнаў гэта праходзіць публічна, напрыклад пры правядзенні дзён сельскіх Саветаў. Своечасовая сумесная работа прыносіць плён. На месцы вызваленых будынкаў адкрытыя вытворчасці, склады, магазіны, фермы, з'явіліся новыя суб'екты гаспадарання, у вобласці створана каля 750 новых рабочых месцаў. Частка аб'ектаў выкарыстоўваецца пад жыллё і для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі. Яшчэ 50 пакупнікоў рамантуюць, праводзяць рэканструкцыю, зносяць пабудовы для будаўніцтва новых.

## Рыбны цэх замест клуба і ферма на ферме

Як адзін з паспяховых прыкладаў праекта на прададзеным за адну базавую велічыню аб'екце ў Кобрынскім раёне Надзея Мікалаеўна назвала прадпрыемства «ЮдзісІнвест». У 2016 годзе гэты суб'ект гаспадарання купіў адміністрацыйны будынак у вёсцы Шамятоўка. Памяшканне плошчай 473,8 квадратнага метра два гады не маглі прадаць нават за адну базавую. Паспяховым стаў толькі восьмы па ліку аўкцыён. Пакупнік пабудаваў комплекс цэхаў па перапрацоўцы рыбы. Калі справы пайшлі добра, Кобрынскі райсавет сваім рашэннем перадаў прадпрыемству двухпавярховы будынак былога клуба ў гэтай жа вёсцы, які раней хацелі знесці. І прадпрымальнік у сціслыя тэрміны задзейнічаў пабудову. Фірма паспяхова развіваецца, у вёсцы з'явіліся дзясяткі новых рабочых месцаў, парадак падтрымліваецца на навакольнай тэрыторыі (дарэчы, пра дадзенае прадпрыемства «Звязда» расказвала ў чэрвені 2021 года ў публікацыі «Новае жыццё пустога будынка»).

Такіх і падобных прыкладаў у вобласці можна знайсці нямала. Было шэсць няўдалых спроб прадаць жывёлагадоўчую ферму ў Столінскім раёне. Гаворка ідзе пра 12 аб'ектаў на зямельным участку амаль у 12 гектараў. Цану зніжалі на 20, 50, 80 працэнтаў, а потым за адну базавую старую ферму ўсё ж купіў прадпрымальнік. Цяпер там размешчана сельгаспрадпрыемства «Грушава-МІЛК», якое займаецца малочнай жывёлагадоўляй. Летась прыватнікі-аграрыі атрымалі 1750 тон малака. Працуюць на ферме 22 чалавекі.

У вёсцы Ліпнікі Брэсцкага раёна на базе будынка былога клуба-бібліятэкі наладжана швейная вытворчасць, у вёсцы Зубелевічы Ляхавіцкага раёна ў былой школе зрабілі залу для ўрачыстых мерапрыемстваў. Спіс можна доўжыць, галоўнае, што былая маёмасць не разбураецца, не ідзе пад бульдозер, а прыносіць карысць людзям.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Брэсцкага аблвыканкама і аўтара.**

**Старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, сенатар Юрый НАРКЕВІЧ:**

— У вобласці назапашаны шматгадовы вопыт работы з маёмасцю, прададзенай за адну базавую велічыню. На яго падставе сфарміраваны падыходы да вырашэння праблем, якія ўзнікаюць у працэсе. На выязным пасяджэнні прэзідыума аблсавета мы мелі магчымасць пазнаёміцца са станоўчымі прыкладамі на Пружаншчыне, а таксама пачулі падрабязны аналіз стану спраў на Брэстчыне ў цэлым. Зыходзячы з гэтага, варта звярнуць увагу на ўзмацненне ўзаемадзеяння паміж мясцовымі Саветамі дэпутатаў і зацікаўленымі службамі рэгіёнаў, кантролю за падтрыманнем парадку на аб'ектах нерухомасці і зямельных участках, што выдзелены для іх абслугоўвання. У дапамогу нам Указ № 330, які нядаўна ўступіў у сілу. Трэба больш актыўна ўкараняць у жыццё навацыі новаўвядзенні заканадаўства, і пустуючых аб'ектаў будзе станавіцца менш.

БУДЗЕМ СЯБРАВАЦЬ РЭГІЁНАМІ

# ДЗЕЙНІЧАЦЬ БЕЗ ПАСРЭДНІКАЎ

## Якія мэты ставяць арганізатары II з'езда малых гарадоў Гродзенскай і Ніжагародской абласцей

**ФОРУМ мае адбыцца ў другой палове верасня ў гарадскім пасёлку Зэльва. Для яго падрыхтоўкі створаны аргкамітэт пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Валянціна СЕМЯНЯКІ. Днямі адбылося чарговае пасяджэнне аргкамітэта, на якім вызначаны трэкі ўзаемадзеяння малых гарадоў беларускага і расійскага рэгіёнаў.**



Ніжагародская вобласць — адзін з нямногіх расійскіх рэгіёнаў, якія мае сваё прадстаўніцтва ў Беларусі. Гродзенцы вырашылі скарыстацца прамымі кантактамі з ніжагародцамі для наладжвання партнёрскіх сувязяў. Такім чынам узнікла ідэя правесці сумесны форум з удзелам прадстаўнікоў абодвух рэгіёнаў.

— Трэба сказаць, што нашых будучых расійскіх партнёраў у першую чаргу зацікавіў фармат аб'яднання Гродзенскай вобласці, які называецца Партнёрскі альянс раёнаў па ўстойлівым развіцці. У яго склад уваходзяць шэсць раёнаў вобласці. Менавіта іх патэнцыял было вырашана аб'яднаць для агульных праектаў, — адзначыў Валянцін Семяняка.

Такая дамоўленасць стала лейтматывам I з'езда малых гарадоў Гродзеншчыны і Ніжагародской вобласці. Форум адбыўся летась у гарадскім пасёлку Вача расійскага рэгіёна. Беларуская дэлегацыя прэзентавала на ім свой эканамічны патэнцыял.

— Мы прадставілі прадукцыю мясакамбіната, фабрыкі мастацкіх вырабаў, буклеты мэблевай фабрыкі. Уся выстаўачная экспазіцыя была вельмі добра прынята, усё, што мы прывезлі, — даволі хутка раскуплена, — успамінае **старшыня Слонімскага райсавета дэпутатаў Алег ТАРГОНСКІ.** — Мы заўважылі, што надзвычай папулярныя ў расіян нашы льняныя вырабы.

У сваю чаргу, беларусы зацікавіліся вытворчасцю гаспадарчых прылад на аб'яднанні «Праца» ў гарадскім пасёлку Вача Ніжагародскай вобласці. Тут вырабляюць сякеры, нажы, малаткі і іншыя рэчы метадам прамой коўкі. Гэта надае асаблівую трываласць вырабам у адрозненне ад парашковай металургіі. Прадукцыя даражэйшая, але больш якасная. Як аказалася, гэтая вытворчасць доўгі час была ў заняпадзе, але мясцовыя прадпрымальнікі вырашылі яе аднавіць. Магчыма, такая прадукцыя магла б мець попыт і сярод беларускіх спажыўцоў.

Звярнулі ўвагу гродзенцы і на казакоўскую філігрань — рэчы з дроту вельмі тонкай работы. Сувеніры, упрыгажэнні атрымліваюцца дзівосных узораў. Яны робіцца ўручную майстрамі на прадпрыемстве мастацкіх вырабаў.

— Патэнцыял Ніжагародскай вобласці даволі значны. Гэта трэці рэгіён Расійскай Федэрацыі ў такім плане. Вельмі важна, што абодва бакі гатовыя ўзаемадзейнічаць у рамках імпартазамяшчэння ва ўмовах санкцый. Паколькі ніжагародцы актыўна развіваюць сельскую гаспадарку, яны вядуць перагаворы па супрацоўніцтве з Мастоўскім рамонтным заводам і Шчучынскім занальным інстытутам раслінаводства. Расіяне зацікаўленыя ў пастаўках на іх рынак прадуктаў харчавання, асабліва мясной і малочнай прадукцыі, а таксама вырабаў лёгкай прамысловасці, — падкрэсліў Валянцін Семяняка.

Ён заўважыў, што пакуль ёсць пытанне лагістыкі, але ўжо наладжаны авіямаршрут Мінск — Ніжні Ноўгарад. Вырашаецца пытанне па арганізацыі прамога чыгуначнага маршруту. Лагістычныя кампаніі гатовыя забяспечваць суправаджэнне грузаў у абодва бакі.

Для гродзенскага альянсу раёнаў важна дзейнічаць у рамках нацыянальнай праграмы па ўстойлівым развіцці. Супрацоўніцтва з Ніжагародскай вобласцю якраз і з'яўляецца ў дадзеным сэнсе перспектыўным, таму што тут задзейнічаны эканамічны складнік. Менавіта такі акцэнт мяркуецца зрабіць на II з'ездзе малых гарадоў Гродзенскай і Ніжагародскай абласцей.

— На гэты раз мы ставім задачу і просім, каб прыязджалі прадстаўнікі бізнесу. Гэтым самым мы зможам мінімізаваць пасрэдніцкія структуры, працаваць непасрэдна. Хочацца, каб наша прадукцыя была больш шырока прадстаўлена. Такія сустрэчы дапамогуць узгадніць усе моманты. Магчыма, варта звярнуць увагу на тое, як выконваюцца сумесныя праграмы. Трэба, каб людзі адчулі карысць у эканоміцы, каб з'явіліся новыя працоўныя месцы, новыя лагістычныя схемы, ішла рэалізацыя прадукцыі. Галоўнае — пошук рэсурсаў для забеспячэння ўстойлівасці нашых тэрыторый. Наш партнёрскі альянс зацікаўлены ў гэтым, — заўважыў Алег Таргонскі.

Другі з'езд малых гарадоў адбудзецца ў другой палове верасня ў Зэльве. Мяркуецца, што ён пройдзе ў рамках абласнога фестывалю-кірмашу «Дажынкі». Чакаецца каля ста чалавек у складзе ніжагародскай дэлегацыі, у тым ліку артысты і рамеснікі, якія будуць непасрэдна задзейнічаны на кірмашы.

— І Зэльва, і Вача падобныя паміж сабой і па колькасці насельніцтва, і па эканамічным развіцці. Ёсць нямала агульных напрамкаў, напрыклад, па питаннях добраўпарадкавання тэрыторый, эфектыўным развіцці сельскай гаспадаркі. Да таго ж расійскі бок выказаў зацікаўленасць да свята «Дажынкі», якое адбудзецца ў нас 23 верасня, — паведаміў **старшыня Зэльвенскага райсавета дэпутатаў Вадзім ПАНАСІК.**

Плануецца, што падчас з'езда будзе разгледжана некалькі трэкаў па інтарэсах. У іх ліку аграпрамысловы комплекс, дзейнасць органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Гродзенцы падзеляцца вопытам работы па добраўпарадкаванні населеных пунктаў, па стварэнні музеяў сельскага быту. Будзе таксама трэк, прысвечаны турызму з удзелам расійскіх тураператараў. Гродзенцы мяркуюць зацікавіць сваімі санаторыямі, ландшафтнымі і вытворчымі турыстычнымі маршрутамі. Будуць наладжвацца адносіны паміж маладзёжнымі суполкамі. Плануецца заключыць дагаворы аб супрацоўніцтве паміж раёнамі Гродзенскай і Ніжагародскай абласцей.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота zelwa.by.**

# «ШЧАСЦЕ — ДАРЫЦЬ ДАБРО ЛЮДЗЯМ»

## Як старэйшына аб'яднала вяскоўцаў добрымі ідэямі

**У вёсцы Папоўка, што ў Сенненскім раёне, здаецца, кожны ведае Алу Іванаўну Шмурадку. Не толькі з-за таго, што яна ўзначальвае адзіны ў населеным пункце сацыяльна-культурны аб'ект — вясковы клуб, але і таму, што яна, як ніхто іншы, умее дзяліцца цяплом і аб'ядноўваць вакол сябе такіх жа нераўнадушных людзей. Можа, таму яе залаты ўзрост па пашпарце не адпавядае ўнутранаму, не па гадах бадзёраму, аптымізму.**



